ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Настаўніцкая газета

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

№ 61(5243) Субота, 2 чэрвеня 2001 года

Кошт у розніцу — 51 руб.

Пра што б хацелася сказаць на II з'ездзе настаўнікаў Рэспублікі Беларусь

"Я сказаў бы настаўніку "дзякуй"

Іван Антонавіч Шчурок, намеснік старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, усё жыццё, як ён жартаўліва заўважыў пра сябе ў гутарцы, хацеў быць настаўнікам, а вось стаў чыноўнікам. На мінулым тыдні ён прыняў удзел у пасяджэнні савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, якое адбылося на базе Лужаснянскай школы-інтэрната-гімназіі, што ў Віцебскім раёне. Мы выкарысталі магчымасць пагутарыць з ім на актуальную тэму.

— Няхай, мабыць, гэта будзе некалькі ўзнёсла і ўзвышана, але з трыбуны з'езда ў першую чаргу я сказаў бы настаўнікам "дзякуй". Як грамадзянін, як чыноўнік і як чалавек, які добра ведае сістэму і перажывае за яе. На Віцебшчыне я ўжо жыву і працую дваццаць сем гадоў пасля заканчэння гістарычнага факультэта БДУ. Дванаццаць гадоў я адпрацаваў у сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Выдатна бачу, як і ў якіх умовах сёння працуе настаўнік. Сёння ён на самай справе — падзвіжнік, нягледзячы ні на што, аддае ўсе сілы сваёй справе. Хаця, на жаль, супраць яго і не на карысць усім нам і выхаванню падрастаючага пакалення, сёння працуюць часам і сродкі масавай інфармацыі, тэлебачанне, кінавідэатэхніка і г.д.

Так, настаўнік вучыць! І робіць гэта якасна! Калі, напрыклад, узяць нашу Віцебскую вобласць, дык толькі ў мінулым годзе амаль сорак працэнтаў выпускнікоў паступілі ў сярэднеспецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Гэта вельмі высокі паказчык. І ён з году ў год расце. Я назіраю такую тэндэнцыю з вышыні сваёй пасады вось ужо пяць гадоў. А гэта значыць, што настаўнік працуе якасна.

На мой погляд, за апошні час вельмі мала настаўнікаў мы прадстаўляем да ўзнагарод і ганаровых званняў. Мы не заахвочваем настаўніка матэрыяльна, як таго заслугоўвае яго праца. Канечне, пэўны зрух ёсць. Але ён нязначны.

Увогуле, я лічу, што наша грамадства стабільнае дзякуючы перш за ўсё настаўніку. У шырокім сэнсе гэтага слова. Патлумачу, што калі я гавару "настаўнік", то маю на ўвазе і выкладчыка вышэйшай навучальнай установы, а таксама сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і, безумоўна, настаўніка агульнаадукацыйнай школы.

Гэта першае. Другое — пра што сказаў бы на з'ездзе — гэта пра стан матэрыяльна-тэхнічнай базы адукацыйных ўстаноў. Усіх! Пачынаючы з дашкольных. У сваёй вобласці мы захавалі сістэму: нічога не закрывалі, не разбуралі і не мянялі. І на набыццё абсталявання, і на рамонт мы, як маглі і наколькі маглі, знаходзілі і выдзялялі сродкі з абласнога, раённага і гарадскога бюджэту. Аднак патрэбна прызнаць, што тыя праграмы, якія былі прыняты на ўрадавым узроўні — я маю на ўвазе рэспубліканскія праграмы "Сельская школа", "Інфарматызацыя сістэмы адукацыі і г.д. — яны не выконваюцца. Таму я лічу, што сёння неабходна агульнымі намаганнямі прыняць усе меры для таго, каб выправіць становішча, якое склалася. І, мабыць, сёння пра гэта гаварыць не модна, але, напрыклад, я вярнуўся б да палажэння аб базавым прадпрыемстве. Гэта вельмі важна! Так, поспех у нашай справе залежыць ад сумеснай дзейнасці кіраўнікоў навучальнай установы, раённага аддзела адукацыі, райгарвыканкама. І гэтага ніхто не аспрэчвае. Аднак, калі будзе дакумент, прыняты на ўзроўні ўрада, зусім па-іншаму — па-дзяржаўнаму! — "загаворыць" кіраўнік прадпрыемства. І гэта будзе толькі на карысць справе, сістэме, усім нам.

Што яшчэ мяне крайне хвалюе?

Па прагнозах спецыялістаў ў 2007 годзе мы апынёмся ў дэмаграфічнай яме. І нам патрэбна зрабіць усё для таго, каб гэтае падзенне змякчыць. Сістэму адукацыі чакае рэарганізацыя і скарачэнне колькасці навучальных устаноў. Асабліва гэта тычыцца сельскай школы. Здавалася б, у нас ёсць яшчэ ў запасе пяць-шэсць гадоў. Аднак мы ўжо сёння аналізуем сітуацыю і працуем з органамі ўлады ў гэтым накірунку. Лічу, што гэта не тая сітуацыя, з якой няма выйсця. Мы бачым з яе выйсце! Галоўнае, каб гэтай праблемай праніклісся кіраўнікі на месцах — калгасаў і саўгасаў, прамысловых прадпрыемстваў, райгарвыканкамаў. Павінны быць апорныя, сярэднія базавыя школы, выдатна адладжана сістэма падвозу вучняў і харчавання, неабходна захаваць і надалей развіваць няспынную сістэму адукацыі, якая цалкам сябе апраўдала. А ў нашай вобласці, напрыклад, яна ўмацоўваецца і развіваецца: наладжваецца цесная сувязь паміж школамі, тэхнікумамі, прафтэхвучылішчамі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, што асабліва важна ў першую чаргу для сельскага вучня. Я думаю, мы зможам адрэгуляваць сітуацыю. Тут яшчэ, безумоўна, выключна важна прадбачыць, як сацыяльна абараніць настаўніка, бо зменшыцца вучэбная нагрузка яго. Словам, усім нам патрэбна добра падумаць, каб у 2007 годзе для настаўніка не было непрыемных і крыўдных нечаканасцей. І я як чыноўнік, які курыруе сацыяльную сферу, бачу тут для сябе асабіста прыярытэтны накірунак дзейнасці.

І яшчэ. Калі мы гаворым пра заработную плату настаўніка, які працуе сёння на паўтары стаўкі, мы забываем пра другі бок медаля, пра тое, што фактычна ён працуе на знос. Гэта патрэбна прызнаць. Сярэдні заробак настаўніка 130 тысяч. Аднак вось у нас нядаўна прайшлі раённыя і гарадскія сходы настаўнікаў, выступалі ўсе: дырэктары школ і радавыя настаўнікі, але ніхто з іх на першае месца не паставіў праблему заработнай платы. На першы план усе ставяць матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сістэмы адукацыі. А гэта гаворыць пра высакародства настаўніка, з якім можна і трэба глядзець у будучае толькі з аптымізмам.

Падрыхтавала Святлана БЕНЬ.

Ура! Канікулы!

У сярэдніх школах, каледжах, ліцэях Мінска прайшлі ўрачыстыя лінейкі, прысвечаныя заканчэнню навучальнага года.

У выпускнікоў наперадзе экзамены. Малодшыя школьнікі будуць адпачываць у загарадных аздараўленчых летніках.

НА ЗДЫМКУ: вучні 4 "А" класа сярэдняй школы № 181 радуюцца канікулам.

Фота Аляксандра ДЗІДЗЕВІЧА, БЕЛТА.

З пасяджэння калегіі Міністэрства адукацыі

Закладзены прававыя асновы павышэння кваліфікацыі

25 мая адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства адукацыі. Галоўнае пытанне, якое было разгледжана на ім, — аб Канцэпцыі і Праграме развіцця сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Рэспублікі Беларусь.

Поспех рэалізацыі сацыяльна-эканамічных і палітычных пераўтварэнняў у краіне, далейшага развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу ў значнай меры залежыць ад сучаснай кадравай палітыкі, мер, якія прымаюцца па развіцці кадравага патэнцыялу, павышэння прафесіяналізму і кампетэнцыі работнікаў усіх сфер дзейнасці.

Вырашэнню дадзенай праблемы ў значнай меры садзейнічае створаная ў рэспубліцы сетка ўстаноў адукацыі па павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў. На сённяшні дзень у краіне працуюць 377 навучальных устаноў (падраздзяленняў) паслядыпломнай адукацыі, у тым ліку Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, Акадэмія паслядыпломнай медыцынскай адукацыі, 39 інстытутаў павышэння кваліфікацыі, 26 факультэтаў і спецфакультэтаў пры вышэйшых навучальных установах, 273 цэнтры і курсы пры міністэрствах, прадпрыемствах, установах і арганізацыях. У 2000 годзе ў гэтых навучальных установах (падраздзяленнях) прайшлі навучанне каля 570 тыс. чалавек.

Нягледзячы на складаныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў не толькі не знізіла тэмпаў развіцця, але і значна павялічыла сетку навучальных устаноў. Так, напрыклад, за апошнія 10 гадоў іх у рэспубліцы адкрыта больш за 70, у тым ліку 36 недзяржаўных.

Прынятыя ўрадам краіны меры дзяржаўнага рэгулявання паслядыпломнай адукацыі далі магчымасць увесці сістэму льготнага падаткаабкладання ўстаноў (падраздзяленняў) павышэння кваліфікацыі.

Разам з тым, як зазначыў у сваім дакладзе начальнік аддзела павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Міністэрства адукацыі А.І.Абрамаў, у пераадоленні негатыўных тэндэнцый сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны адукацыйныя меры сваёй ролі яшчэ не сыгралі. У значнай ступені гэта тлумачыцца адсутнасцю канцэпцыі развіцця сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, якая б вызначала ролю і месца паслядыпломнай адукацыі ў дзяржаўнай, сацыяльна-эканамічнай палітыцы краіны.

У падобнай крызіснай сітуацыі стаўка павінна быць зроблена на некаторыя ключавыя — "прарыўныя" накірункі дзеянняў дзяржавы і ў тым ліку моцнага ўплыву на інтэлект, адукаванасць грамадзян. Гэта азначае, падкрэсліў Анатоль Іванавіч, што арганізацыя прагрэсіўнай сістэмы паслядыпломнай адукацыі павінна заснаваць на пазнанні заканамернасцяў рынку працы, попыту-прапановы на кадры пэўнай колькасці і якасці.

Паспяховае развіццё эканамічных і палітычных пераўтварэнняў у краіне ў многім будзе залежаць ад таго, наколькі цяперашні корпус кіраўнікоў і спецыялістаў, рабочых кадраў вытрымае праверку на прафесійную сталасць. Для гэтага неабходна абнавіць іх прафесійна-эканамічную адукацыю на 50-70 працэнтаў, а таксама развіць эканамічна стабілізаваную сістэму паслядыпломнай адукацыі. З сістэмы з чыста адукацыйнымі функцыямі яна павінна трансфармавацца ў сістэму адукацыйна-кансультацыйных паслуг, якая валодае высокім патэнцыялам выкладчыцкіх кадраў, банкамі дадзеных аб існуючым вопыце правядзення працы, методыкамі дыягностыкі персаналу, сучаснымі метадамі і сродкамі навучання.

Праз навучанне ў сістэме павышэння кваліфікацыі персанал прадпрыемства павінен авалодаць пытаннямі даследавання рынку і рыначнымі прагнозамі, стратэгіі выхаду на рынак, рыначнай палітыкі ўтварэння цэн і інструментамі маркетынгу. Вельмі важным з'яўляецца вызначэнне асноўных мэт дзейнасці прадпрыемства, якія прадугледжваюць планаванне абароту, расходаў, ліквіднасці, поспеху, фінансавання і іншых пытанняў.

Дакладчык адзначыў таксама, што новыя падыходы да адукацыі мяркуецца рэалізаваць праз узбагачэнне спецыялістаў сацыяльным вопытам, карыснай ідэяй ці дабратворным пабуджэннем да дзеяння, гэта значыць на стыках з культурай, палітыкай, праблемамі іншай галіны. Таму важна не падладжваць змест адукацыі пад тып выпускаемай прадукцыі, цыкл жыцця якой заканчваецца, а ўключацца ў механізм станаўлення рынкавых адносін у краіне, што дасць магчымасць забяспечыць эфектыўную працу адукацыйнай сістэмы ў цэлым.

Прапановы па ўдасканаленні сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў знайшлі сваё адлюстраванне ў Канцэпцыі і Праграме развіцця сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Рэспублікі Беларусь. Дакументы распрацаваны на аснове аналізу сучаснага сацыяльна-эканамічнага ўзроўню развіцця краіны, ролі сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у фарміраванні яканага ўзроўню кадравага патэнцыялу, абагульнення вопыту функцыянавання айчыннай і замежнай сістэм паслядыпломнай адукацыі і накіраваны на выкананне Пастановы Савета Міністраў ад 12.04.99г. № 506 "Аб асноўных накірунках развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі". У Канцэпцыі вызначаны механізм яе рэалізацыі, які прадугледжвае каардынацыю дзеянняў у гэтай галіне Міністэрства адукацыі, іншых органаў дзяржаўнага кіравання, навучальных устаноў.

Як зазначыў у канцы свайго выступлення А.І.Абрамаў, распрацаваная Праграма рэалізацыі Канцэпцыі развіцця павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у Рэспубліцы Беларусь дасць магчымасць да 2005 года стварыць сучасную і эфектыўную сістэму навучання да 600 тыс. кіраўнікоў і спецыялістаў у год і забяспечыць фарміраванне яканага кадравага патэнцыялу, кадравую падтрымку інавацыйных працэсаў на Беларусі, удасканаленне структуры рынку працы і занятасці насельніцтва, прафесійнае арыентаванне моладзі.

Усе наступныя выступоўцы, якія прынялі ўдзел у абмеркаванні названага пытання (а гэта былі прадстаўнікі галіновых міністэрстваў, рэктары ВНУ, у тым ліку недзяржаўных, а таксама ўстаноў павышэння кваліфікацыі), падкрэслілі своечасовасць прыняцця дакументаў, што павінна станоўча адбіцца на тых працэсах, якія адбываюцца ў сацыяльна-эканамічнай сферы нашай краіны. Прагучалі таксама прапановы паскорыць распрацоўку закона аб павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў у Рэспубліцы Беларусь, ажыццяўляць маніторынг якасці павышэння кваліфікацыі ва ўстановах, якія займаюцца гэтай дзейнасцю, вырашыць пытанні сацыяльна-эканамічнага характару і ў першую чаргу — аплаты працы выкладчыкаў ва ўстановах павышэння кваліфікацыі, надаць больш паўнамоцтваў Міністэрству адукацыі для ажыццяўлення навукова-метадычнага забеспячэння і рэгулявання працэсу павышэння кваліфіцыі ў краіне, чаму ў пэўнай ступені паспрыяў бы і больш высокі статус структурнага падраздзялення, якое займаецца

(Працяг на 2-й стар.)

Академия последипломного образования выступает с инициативой создания Республиканского общественного объединения — Белорусская ассоциация "Развивающее образование"

Членами нового объединения могут стать:

* учителя, работающие по программам развивающего обучения Д.Б.Эльконина — В.В.Давыдова и Л.В.Занкова;
* педагоги, апробирующие авторские методики и новые технологии обучения;
* научные работники, методисты, специалисты образования, родители и другие лица, содействующие внедрению современных образовательных технологий в педагогическую практику, в том числе общественные организации, юридические лица.

Учредительная конференция по созданию Республиканского общественного объединения "Развивающее образование" состоится 10 июля 2001 года по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, д. 20, Академия последипломного образования, ауд. 412.

Начало работы в 11 часов.

Регистрация участников с 9.00 до 11.00.

Проживание в общежитии АПО по адресу: ул. Беды, 24. Стоимость проживания в сутки — 900 рублей.

Командировочные расходы за счет командирующей организации.

Об участии в конференции необходимо *сообщить до 20 июня 2001 г. в организационный комитет по адресу:* 220040, г. Минск, ул. Некрасова, 20, АПО, Центр развивающих педагогических технологий (с пометкой "Конференция") или по телефону в Минске (8-017) 285-78-55.

Оргкомитет учредительной конференции.

Акадэмія паслядыпломнай адукацыі з 1 па 16 ліпеня 2001 г.

праводзіць

аўтарскія курсы на гаспадарча-разліковай аснове па адукацыйнай сістэме Д.Б.Эльконіна — В.В.Давыдава

Кошт поўнага тэарэтычнага курса аднаго года навучання (без пражывання і харчавання) **наступны:**

— настаўнікі падрыхтоўчых і 1-х класаў — 72000 (семдзесят дзве тысячы) рублёў;

— настаўнікі 2-х, 3 — 4-х класаў, метадысты (з ліку настаўнікаў, якія прайшлі падрыхтоўку па гэтай сістэме) — 67000 (шэсцьдзесят семь тысяч) рублёў;

— настаўнікі матэматыкі 5-х і 6-х класаў — 52000 (пяцьдзесят дзве тысячы) рублёў;

— настаўнікі беларускай мовы, гісторыі 5-х і 6-х класаў, псіхолагі — 45000 (сорак пяць тысяч) рублёў;

— настаўнікі рускай мовы 5-х і 6-х класаў — 58000 (пяцьдзесят восем тысяч) рублёў.

Разліковы рахунак 3622000000391 АСБ "Беларусбанк". Філіял 520, код 253, УНН 100377863, ОКПО 05897147 (курсы па сістэме Д.Б.Эльконіна — В.В.Давыдава).

Кошт пражывання ў інтэрнаце 900 рублёў у суткі.

Аб удзеле ў курсах просьба паведаміць да 25 чэрвеня 2001 г.

Даведкі па тэлефоне 285-78-55.

Паважаныя чытачы!

15 мая распачалася падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2001 года.

Падпісацца на "Настаўніцкую газету" можна ў любым паштовым аддзяленні краіны і ў агенцтвах "Белсаюздруку".

Падпісаны кошт для індывідуальных падпісчыкаў на месяц — 635 рублёў, на квартал — 1905 рублёў, на паўгоддзе — 3810 рублёў.

Па ведамаснай падпісцы на месяц — 1375 рублёў, на квартал — 4125 рублёў, на паўгоддзе — 8250 рублёў.

Паведамляе прэс-цэнтр Міністэрства адукацыі

Што, дзе, калі адбудзецца ў чэрвені

1-15 чэрвеня ў Нацыянальным цэнтры творчасці дзяцей і моладзі (вул. Кірава, 14) экспануецца выніковая выстава народнай студыі "Востраў", прысвечаная міжнароднаму Дню абароны дзяцей.

3-6 чэрвеня Рэспубліканскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва прыме ўдзел у Міжнароднай алімпіядзе экалагічных праектаў у г.Анталля (Турцыя).

4 чэрвеня Рэспубліканскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва праводзіць на экалагічнай сцежцы "Дразды" экалагічную акцыю "Зберажэм сябе і Зямлю".

4-7 чэрвеня на базе мазырскага ПТВ № 131 будаўнікоў праводзіцца рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства сярод навучэнцаў ПТНУ па прафесіі "Сталяр; станочнік дрэваапрацоўчых станкоў".

З **4 па 16 чэрвеня** ў Рэспубліканскім інстытуце прафесійнай адукацыі будуць працаваць мэтавыя курсы "Сучасныя тэхналогіі і арганізацыя будаўнічай вытворчасці".

5-8 чэрвеня Рэспубліканскі Дом тэхнічнай і мастацкай творчасці навучэнскай моладзі (вул. Славінскага, 12) будзе прымаць удзельнікаў VII Рэспубліканскага злёту вынаходнікаў і рацыяналізатараў-навучэнцаў і работнікаў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

5-8 чэрвеня на базе Салігорскага гарадскога цэнтра тэхнічнай творчасці пройдуць рэспубліканскія спаборніцтвы па ракетамадэльным спорце, у якіх прымуць удзел 50 навучэнцаў ва ўзросце да 18 гадоў.

З **5 па 22 чэрвеня** на возеры Макоўза Лагойскага раёна будзе працаваць "Экашкола-2001".

5-7 чэрвеня на базе Рэспубліканскага адукацыйнага цэнтра Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі будзе праходзіць навукова-практычная канферэнцыя "Дзяржаўная маладзёжная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь".

6-8 чэрвеня ў Нацыянальным інстытуце адукацыі адбудзецца VII міжнародная канферэнцыя "Сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя насельніцтва, якое пацярпела ад экалагічных і тэхнагенных катастроф".

8-10 чэрвеня творчы калектыў "Пегас" Рэспубліканскага цэнтра мастацкай творчасці навучэнскай моладзі "Юнацтва" выступіць з тэматычнай канцэртнай праграмай на гарадскім турысцкім злёце "Люблю наш край, старонку гэту" на р. Іслач (Ракаў), прымеркаваным да Сусветнага Дня аховы навакольнага асяроддзя.

11-14 чэрвеня ў Смалявіцкім раёне адбудзецца рэспубліканскі турысцкі злёт школьнікаў і навучэнцаў ПТВ.

11-17 чэрвеня ў Рэспубліканскім экалагічным цэнтры дзяцей і юнацтва будзе працаваць рэспубліканская школа юных фермераў.

12-15 чэрвеня ў Бішкеку (Кіргізская Рэспубліка) адбудзецца VI пасяджэнне Канферэнцыі міністраў адукацыі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў "Арганізацыйнае забеспячэнне рэалізацыі міністэрствамі адукацыі дзяржаў-удзельніц СНД сумесных праграм развіцця адукацыі".

На канферэнцыі плануецца разгледзець пытанні развіцця супрацоўніцтва ў галіне інфарматызацыі адукацыі, распрацоўкі прапаноў па механізме ўзгаднення адукацыйных стандартаў дзяржаў-удзельніц СНД, аб механізме рэалізацыі Міждзяржаўнай праграмы рэалізацыі Канцэпцыі фарміравання адзінай (агульнай) адукацыйнай прасторы СНД, аб міждзяржаўных дысертацыйных саветах, аб стварэнні адзінай кваліфікацыйнай таблицы ўзроўняў і ступеняў адукацыі дзяржаў-удзельніц СНД, аб распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праграм падрыхтоўкі вучэбных і вучэбна-метадычных комплексаў і г.д.

12-17 чэрвеня ў Бішкеку пройдзе IX пасяджэнне Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

На пасяджэнні Савета будуць абмяркоўвацца наступныя пытанні:

— аб праекце Устаноўчага дагавора аб стварэнні Фонду падтрымкі супрацоўніцтва ў галіне адукацыі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў;

— аб распрацоўцы праекта Пагаднення па забеспячэнні грамадзянам дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў доступу ў агульнаадукацыйныя ўстановы іншых Бакоў на ўмовах, якія даюцца грамадзянам гэтых дзяржаў;

— аб прапановах па ўзгадненні сістэм перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў у галіне прафесійнай адукацыі;

— аб падрыхтоўцы і выданні ўзгодненага слоўніка тэрмінаў і азначэнняў сістэмы адукацыі;

— аб распрацоўцы праектаў Мадэльнага класіфікатара прафесій, спецыяльнасцей і кваліфікацый дзяржаў-удзельніц СНД і Пагаднення аб парадку яго прымянення;

— аб распрацоўцы рэкамендацый па парадку правядзення атэстацыі і акрэдытацыі адукацыйных устаноў.

14-17 чэрвеня на базе Брэсцкага абласнога цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў пройдуць рэспубліканскія спаборніцтвы па суднамадэльным спорце (2-і этап).

З **15 па 30 чэрвеня** ў Крупскім раёне будзе працаваць рэспубліканскі краязнаўчы летнік навучэнцаў.

18-22 чэрвеня ў Рэспубліканскім экалагічным цэнтры дзяцей і юнацтва пройдуць заняткі рэспубліканскай біялагічнай школы.

19-21 чэрвеня ў Мінску адбудзецца міжнародная канферэнцыя "Прыёмныя бацькі за правы і шчасце дзяцей", на якой сустрэнуцца сем'і, якія ўзялі на выхаванне дзяцей-сірот.

20 чэрвеня ў ПТВ № 221 кулінарыі адбудзецца выпускны вечар. Пачатак у 16.00.

22 чэрвеня ў вышэйшым прафесійным вучылішчы бытавога абслугоўвання насельніцтва адбудзецца выпускны вечар. Пачатак у 15.00.

З **27 чэрвеня па 2 ліпеня** на базе Салігорскага гарадскога цэнтра тэхнічнай творчасці пройдуць рэспубліканскія спаборніцтвы па авіямадэльным спорце, у якіх прымуць удзел 98 навучэнцаў ва ўзросце да 18 гадоў.

З **27 чэрвеня па 5 ліпеня** ў Бярэзінскім дзяржаўным біясферным запаведніку праводзіцца рэспубліканская экспедыцыя "Мой край".

28 чэрвеня Міністэрства адукацыі праводзіць пасяджэнне калегіі па пытанні "Аб стане работы па забеспячэнні агульнаадукацыйных школ рэспублікі падручнікамі, вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, тэхнічнымі сродкамі навучання для арганізаванага пачатку 2001-2002 навучальнага года.

Падрыхтавала Ірына КОНЧЫЦ.

Ф. РД-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНT на газету / часопіс — індэкс выдання

Настаўніцкая газета

(назва выдання) — Колькасць камплектаў

На **2001** год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТАЧКА

ПВ	месца	літар

на газету / часопіс — індэкс выдання

Настаўніцкая газета

(назва выдання)

Кошт: падпіскі руб.____ / пераадрасоўкі руб.____ — Колькасць камплектаў

На **2001** год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

З пасяджэння калегіі Міністэрства адукацыі

Закладзены прававыя асновы павышэння кваліфікацыі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

данымі пытаннямі (цяпер гэта ўсяго толькі аддзел), і інш.

Аналізу функцыянавання сістэмы паслядыпломнай педагагічнай адукацыі прысвяціў сваё выступленне рэктар АПА А.І.Таўгень. Абазначыўшы пазітыўныя зрухі, якія адбыліся ў галіне ў апошнія гады, Алег Ігнатавіч спыніўся на супярэчнасцях і праблемах павышэння кваліфікацыі педагогаў. Гэта: нестыкоўка мадэляў сярэдняй агульнаадукацыйнай школы і вышэйшай адукацыі; пераважная скіраванасць дзейнасці ІПК на дасягненне колькасных паказчыкаў, а не на забеспячэнне высокай якасці адукацыі; слабы ўплыў вынікаў павышэння кваліфікацыі на ўзровень аплаты працы педагога; нізкая забяспечанасць ІПК педагагічнымі кадрамі вышэйшай кваліфікацыі і інш. Выступоўца прапанаваў распрацаваць таксама канцэпцыю і праграму паслядыпломнай педагагічнай адукацыі, дзе сканцэнтравацца на вырашэнні сваіх прафесійных пытанняў.

На пасяджэнні калегіі прагучала такая цікавая інфармацыя. У развітых краінах свету затраты на павышэнне кваліфікацыі супастаўляльныя з затратамі, якія накіроўваюцца на ўсю сістэму адукацыі ўвогуле. У нашай жа краіне, ды і ў многіх постсавецкіх, стаўленне да павышэння кваліфікацыі да гэтага часу пакідае жадаць лепшага. Вялікая ўвага надаецца рэформе агульнаадукацыйнай школы (цяпер ужо — і вышэйшай), а вось гэта сфера на сённяшні дзень — як бы на другім плане. Хоць, як вядома, у Беларусі існуе Міжведамасны савет па павышэнні кваліфікацыі, у які ўваходзяць першыя асобы ўсіх галіновых міністэрстваў. Рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы А.І.Жук выказаў нават думку, што Канцэпцыю і Праграму развіцця сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, перш чым яны трапяць у Савет Міністраў, варта было б разглядаць не на калегіі Міністэрства адукацыі, а на міжгаліновым узроўні — тым жа Міжведамасным савеце. Гэта надало б дакументам (а значыць — і разглядаемай праблеме) большую дзяржаўную значнасць.

Падагульняючы разгляд пытання, міністр адукацыі В.І.Стражаў сказаў:

— На Беларусі ў параўнанні са Злучанымі Штатамі Амерыкі колькасць занятых у сістэме павышэння кваліфікацыі на два, а можа нават і на тры парадкі менш. Які вывад з гэтага можна зрабіць? Рынак адукацыйных паслуг у краіне ў бліжэйшыя 10 гадоў — гэта пераважна рынак паслядыпломнай адукацыі. А зыходзячы з дэмаграфічнай сітуацыі (колькасць вучняў і студэнтаў скарачаецца) колькасць тых, каму трэба перавучыцца, павысіць сваю кваліфікацыю, будзе павялічвацца. Хто павінен гэта рабіць? З пункту гледжання спажыўца — усё роўна хто. Галоўнае, каб гэта рабілася якасна. З пункту ж гледжання дзяржавы працэс гэты павінен быць рэгулюемым. І ажыццяўляць яго навукова-метадычнае забеспячэнне і каардынацыю належыць Міністэрству адукацыі. А для гэтага патрэбна нарматыўна-прававая база. Канцэпцыя і Праграма якраз і з'яўляюцца той асновай, на якой будзе функцыянаваць і развівацца сістэма павышэння кваліфікацыі краіны, арыентаваная на паэтапную замену функцый цэнтралізаванай эканомікі функцыямі рынкавай ва ўсіх сферах жыцця грамадства...

Наш кар.

Эксперымент

Камп'ютэр прапісаўся ў школе

Камп'ютэр, які прыйшоў некалі ў школу ў якасці сродку навучання на ўрок інфарматыкі, зараз займае ў ёй другое — вялікае і важнае — месца. Ён дапамагае арганізоўваць вучэбна-выхаваўчы працэс, весці навуковыя даследаванні, мець зносіны з усім светам, кіраваць школай. Без камп'ютэра жыць у гэтым стагоддзі ніяк немагчыма. Хто з настаўнікаў, з адміністратараў гэта зразумеў, той сапраўды жыве ўжо ў школе будучыні.

Да камп'ютэра ў 176-й сярэдняй школе Мінска звяртаюцца па многіх пытаннях. Тут яго шануюць як галоўнага памочніка. Ён захоўвае звесткі пра ўсе класы, пра паспяховасць вучняў, пра якасць работы настаўнікаў, вучэбныя планы, спісы супрацоўнікаў, бацькоў і яшчэ шмат чаго. Машына лёгка знаходзіць неабходную вам інфармацыю і апрацоўвае яе. Навучыцца валодаць камп'ютэрам даволі проста. Галоўнае — жаданне. Дастаткова паглядзець, як з машынай спраўляецца Таццяна Уладзіміраўна Івашка, якая ўпершыню села за яго (няхай прабачыць мне Таццяна Уладзіміраўна, што выдаю яе жаночы сакрэт) ужо ў сталым узросце. Яна называе сябе "дыспетчарам па дзецях". У абавязкі Т.У.Івашка ўваходзіць кантроль за наведваннем вучэбных заняткаў вучнямі школы. Яе працоўны дзень пачынаецца ў 8.30 раніцы, калі дзяжурныя вучні з усіх класаў прыносяць ёй спісы вучняў, якія адсутнічаюць на першым уроку. Гэтыя звесткі яна ўносіць у камп'ютэр, а далей ідзе іх аналіз.

"Вось, напрыклад, — расказвае Таццяна Уладзіміраўна, — на першай змене адсутнічала 20 вучняў па школе. З іх: 10 — па ўважлівай прычыне, дзевяць — пакуль невядома па якой, а адзін, мы ведаем, прагуляў. У нас ёсць усе кантактныя тэлефоны бацькоў, па якіх я звязваюся з імі і высвятляю, дзе іх дзеці. Да 12.00 гадзін мы будзем ужо ведаць, дзе кожны з 20 адсутных".

Што атрымлівае школа ад такога кантролю? Колькасць прагульшчыкаў (за той час як быў уведзены такі парадак) значна зменшылася. І як вынік — павысілася паспяховасць, зменшылася колькасць правапарушальнікаў. На камп'ютэры насупраць некаторых прозвішчаў дзяцей стаяць паметкі: УУ — унутрышкольны ўлік, ПВ — дзіця знаходзіцца на ўліку ў міліцыі (таму калі няма гэтых дзяцей на занятках, прымаюцца экстранныя меры), БХ — бясплатнае харчаванне (калі дзіця адсутнічае ў школе, на яго не гатуецца ежа, эканомяцца дзяржаўныя сродкі). А яшчэ вучань, які адсутнічаў на занятках больш за 8 дзён (у школе гэта здараецца толькі па прычыне доўгачасовай хваробы), можа быць упэўнены, што яго не будуць выклікаць на ўроках, яму не давядзецца пісаць кантрольныя, пакуль ён не пройдзе "рэабілітацыйны перыяд", падчас якога настаўнікі-прадметнікі будуць займацца з ім індывідуальна, пакуль ён не дагоніць сваіх аднакласнікаў. За ўсім гэтым працэсам сочыць класны кіраўнік, які атрымлівае памятку па адаптацыі вучня.

176-я школа ўдзельнічае ў эксперыменце Міністэрства адукацыі па камп'ютэрызацыі кіравання школай. Ужо сёння можна гаварыць, што эксперымент удаўся. Кіраваць школай з дапамогай камп'ютэра — гэта выйсце з той руціны, у якой патанулі буйныя гарадскія школы, дзе вучняў больш за тысячу, настаўніцкі калектыў за 100 чалавек ды яшчэ тэхнічны персанал. Камп'ютэр эканоміць час адміністрацыі школы — дырэктара, яго намеснікаў. Ён дазваляе ім больш увагі надаваць праблемным пытанням, творчасці. Камп'ютэр вызваліў усіх ад папяровай валакіты.

Намеснік дырэктара па вучэбнай частцы школы Аляксандр Валер'евіч Касовіч расказаў мне пра свае этапы спасціжэння камп'ютэрных магчымасцей — ад выкарыстання камп'ютэра як друкарскай машынкі да даверу яму важных кіраўніцкіх пытанняў. Камп'ютэр захоўвае ўсю дакументацыю, банк даных на вучняў, настаўнікаў, бацькоў. Машына хутка апрацоўвае патрэбную інфармацыю і выдае рэзультат. Камп'ютэр, як гаворыць Аляксандр Валер'евіч, дапамагае кантраляваць зніжэнне паспяховасці вучняў па прадметах і своечасова адрэагаваць. Вучань можа захоўваць свой статус (выдатніка ці добрага вучня), можа павышаць яго, але ні ў якім разе не зніжаць. Завуч адразу гэта заўважыць, ад яго цяпер цяжка што-небудзь утаіць. Камп'ютэр спрабуе складаць і расклад урокаў. Але ўдаецца яму гэта не зусім добра, бо машына можа многае, але не ўсё. Яна не можа ўлічваць чалавечы фактар. Па гэтай прычыне тэорыя раскладу пакуль поўнасцю не вырашана. Праўда, ёсць добрыя спробы частковага яе вырашэння.

Што б яшчэ хацелася мець кіраўніку? А яшчэ каб "займець" адзіную адукацыйную інфармацыйную прастору, каб любы настаўнік, кіраўнік мог лёгка і хутка звязацца з любой установай нашай сістэмы адукацыі і атрымаць патрэбную яму інфармацыю. Працуе ўжо дзяржаўная праграма "Інфарматызацыя сістэмы адукацыі", таму можна лічыць, што да масавага выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі ў школе засталося не так доўга чакаць. Канешне, на любым шляху ёсць свае перашкоды. І тут не абысціся без іх. Усё яшчэ не гатовы псіхалагічна многія нашы настаўнікі, кіраўнікі школ да выкарыстання інфармацыйных тэхналогій. Усё яшчэ не абучаны яны рабоце за камп'ютэрам. Ёсць праблемы і з забеспячэннем камп'ютэрамі ўстаноў адукацыі. Усё гэта і тармозіць праграму.

У 176-й школе зараз ідзе працэс ліквідацыі камп'ютэрнай неадукаванасці сярод настаўнікаў школы. Дырэктар лічыць, што ў кожным настаўніку, у кожным сучасным чалавеку ёсць, на жаль, пакуль неўсвядомленая патрэбнасць у выкарыстанні камп'ютэрных тэхналогій. Патрэбнасць стане ўсвядомленай, калі настаўнік даведаецца пра магчымасці камп'ютэра. Прымусу ніякага ў школе няма, ідуць вучыцца настаўнікі толькі па асабістаму жаданню.

Камп'ютэрнае жыццё проста захапіла 176-ю школу. Пачынае пакрысе працаваць школьная медыятэка, у якую ўваходзяць бібліятэка, метадычны кабінет, камп'ютэрны клас, Інтэрнет, кабінет тэхнічных сродкаў навучання, школьны сервер. Ужо зараз вучні 176-й школы ўдзельнічаюць у 12 тэлекамунікацыйных праектах, яны наладжваюць кантакты са сваімі аднагодкамі з Расіі, Аўстраліі, Аргенціны, ЗША. І гэта толькі пачатак. Дырэктар школы мяркуе, што доступ у Інтэрнет падштурхне дзяцей лепш вывучаць англійскую мову, дасць ім магчымасць знайсці сабе сяброў і аднадумцаў, дазволіць карыстацца багатым банкам сусветнай інфармацыі.

У 176-ю школу часта за вопытам прыязджаюць з іншых школ Беларусі. І добра, што тыя, няхай крыху і з зайздрасцю, адзначаюць — школе ўжо ніяк не абысціся без камп'ютэра, бо ён — адметная рыса нашага стагоддзя. І 176-я школа таму пацвярджэнне.

Святлана КІРСАНАВА.



Адзіная ў сталіцы ардэнаносная

Сярэдняя школа № 50 Мінска, якую ўзначальвае Алена Антонаўна Комель, з 1966 года з'яўляецца агульнаадукацыйнай навучальнай установай з паглыбленым вывучэннем матэматыкі і фізікі. За 47 гадоў існавання яна набыла цікавую гісторыю. 50-я — адзіная ў Мінску школа, узнагароджаная ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. 99,8 працэнта яе выпускнікоў штогод паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Сёлета з 72 выпускнікоў — 22 ўжо студэнты ВНУ. Усе 10 класы ў гэтай школе — ліцэйскія.

А вось на гэтых трох здымках — імгненні і моманты ісціны з жыцця школы апошніх дзён мая.

Апошні званок... Хвалююча і радасна празвіней ён не толькі для вучняў, але і для настаўнікаў. Адзінаццаць гадоў вучобы з'ядналі лёсы дарослых і дзяцей у вялікую школьную сям'ю. А залогам адзінства, брацтва і роўнасці ў ёй стала нястомная прага ведаў.

Ад усёй душы ўчарашнія школяры выказвалі найвялікшую падзяку сваім настаўнікам, прысвячалі ім словы ўдзячнасці, любві і павагі. І ў гэтых прамовах адчувалася нейкая горыч ад развітання з мілым і добрым домам дзяцінства.

Выкладчыкі, бацькі і адміністрацыйныя работнікі віншавалі сваіх першых выпускнікоў ліцэйскіх класаў ад 50-й матэматычнай сярэдняй школы. Ужо 22 студэнты вышэйшых навучальных устаноў стаялі сярод сваіх равеснікаў на апошняй сваёй школьнай лінейцы. Яны прайшлі папрадметнае тэсціраванне ў акадэміях і атрымалі сертыфікаты з выдатнымі адзнакамі, якія будуць з'яўлятца экзаменацыйнымі на школьных выпускных і ўступных экзаменах у ВНУ.

Ганаровымі гасцямі школьнікаў былі шэфы, кіраўнікі вытворчага аб'яднання "Мінскгарэлектратранс", начальнік службы забеспячэння Аляксей Мікалаевіч Карабань і намеснік генеральнага дырэктара па сацыяльных пытаннях Барыс Давыдавіч Грэйсух. Дырэктар 50-й школы Алена Антонаўна Комель ад імя ўсіх прысутных горача падзякавала за дзейсную шэфскую дапамогу, пра якую могуць толькі марыць кіраўнікі іншых школ. Гэта дзякуючы вытворчаму аб'яднанню "МГЭТ" дзеці правядзяць сваё свята на добраўладкаванай школьнай пляцоўцы, усе дарожкі якой былі маркіраваны белымі палачкамі, а бардзюрчыкі акуратна пабелены. Будаўнікі папрацавалі як мае быць, і школа ператварылася, пахарашэла і пасвятлела да свята.

Барыс Давыдавіч павіншаваў выпускнікоў з паспяховым заканчэннем школы і запрасіў іх паступаць у БПА на яе новы факультэт гарадскога электратранспарту. У сваёй прамове ён сказаў:

— Нам патрэбна разумная, таленавітая і высокаадукаваная моладзь. І мы чакаем інжынерна-тэхнічных спецыялістаў на нашым вытворчым аб'яднанні "Мінскгарэлектратранс".

Зінаіда МІШУРА.

НА ЗДЫМКАХ: з апошнім званком Анюта Васілеўская і Саша Бахараў (11 "А" клас); А.М.Карабань, А.А.Комель, Б.Д.Грэйсух; класны кіраўнік Алена Іванаўна Вечар побач з выпускнікамі.

Фота і тэкст аўтара.

ПТВ: дзень сённяшні

З юбілейным адценнем

У 1946 годзе Савет Міністраў Беларускай ССР Пастановай № 1472 зацвердзіў рашэнне аб адкрыцці ў Гомелі школы гандлёва-кулінарнага вучнёўства з колькасцю навучэнцаў 150 чалавек.

ГЭТЫ год быў самым цяжкім у гісторыі вучылішча: для заняткаў арэндаваліся памяшканні сярэдніх школ, не хапала выкладчыкаў, інструктараў вытворчага навучання, не было мэблі, падручнікаў, наглядных дапаможнікаў. Першы выпуск адбыўся ў 1947 годзе і склаў 106 чалавек, якія навучаліся прафесіям прадаўца і кухара. За гады існавання ў ПТВ-224 падрыхтавана больш за 20 тысяч маладых спецыялістаў для прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання. Многія інжынерна-педагагічныя работнікі гэтай навучальнай установы з'яўляюцца яе ж выпускнікамі: майстры вытворчага навучання Л.Седлярова, Н.Назаранка, С.Піваварава, А.Мурашка, Т.Тарасава, А.Каспяровіч; выкладчыкі Т.Каржуева, А.Зярнова, А.Цайко.

Сёння ў вучылішчы займаецца каля 500 навучэнцаў. Навучанне ажыццяўляецца на сучасным гандлёвым абсталяванні айчыннай і замежнай вытворчасці, навучэнцы ў поўным аб'ёме вывучаюць новыя яго тыпы. Вытворчую практыку праходзяць на лепшых прадпрыемствах горада: у Доме гандлю, рэстаранах "Беларусь", "Майдан", "Гомель", магазіне "Сельмашаўскі". Прафесійная падрыхтоўка навучэнцаў высока ацэньваецца на рэспубліканскіх і абласных конкурсах "Лепшы па прафесіі". У вучылішчы створаны ўсе ўмовы для развіцця мастацкай самадзейнасці і навукова-тэхнічнай творчасці. Працуюць танцавальны, харавы, драматычны гурткі, "Музычная гасцёўня", клуб "Гасціннасць".

У рабоце калектыву ПТВ-224 яўна прасочваецца сістэмнасць, прадуманасць у арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, заснаваныя на аналізе педагагічнай дзейнасці, дасягнутых выніках. Усю работу інжынерна-педагагічных работнікаў умела ажыццяўляе дырэктар ПТВ-224 гандлю Л.Жабская, якая на гэтай пасадзе ўжо 15 гадоў. Неабходна заўважыць, што Людміла Фёдараўна з'яўляецца ветэранам сістэмы адукацыі, прапрацавала ў ёй 30 гадоў. Як і шмат гадоў таму, працуючы майстрам вытворчага навучання, старшым майстрам, намеснікам дырэктара па навучальна-выхаваўчай рабоце, яна і сёння ставіцца да арганізацыі сваёй дзейнасці добрасумленна і патрабавальна.

Людміла Фёдараўна ўнесла вялікі ўклад ва ўдасканаленне навучальна-выхаваўчага працэсу і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы вучылішча. Жадаючы стварыць адзіны мабільны і творчы педагагічны калектыў, яна ўмела каардынуе ўсе звенні адукацыйнага механізма. Дырэктар вучылішча заахвочвае ў сваіх падначаленых імкненне да нетрадыцыйных падыходаў навучання і выхавання маладога пакалення, укаранення перадавога, інавацыйнага. Калектыў ПТВ-224 мае багаты вопыт педагагічнай і прафесійнай дзейнасці, тут наладжана плённае супрацоўніцтва з рознымі прадпрыемствамі горада, для якіх вучылішча рыхтуе спецыялістаў. Як вынік — на базе гэтай навучальнай установы адбылася творчая справаздача па тэме "Аб сумеснай рабоце прафесійна-тэхнічнага вучылішча №224 з прадпрыемствамі гандлю і грамадскага харчавання па падрыхтоўцы рабочых кадраў".

Вопытам работы па дадзеным напрамку падзялілася Л.Жабская, якая адзначыла, што пытанне падрыхтоўкі кадраў — асноўнае пры трансфармацыі любой эканамічнай сістэмы. "Ва ўмовах пераходнай эканомікі, — сказала дырэктар ПТВ-224, — галоўнымі фактарамі павінны быць шматфункцыянальнасць, гнуткая арыентацыя на маладыя галіны і сферы дзейнасці. Змяненні ў грамадстве патрабуюць пошукаў новых шляхоў і падыходаў да прафесійнай адукацыі, дзе яе адэкватная сістэма можа быць створана толькі пры ўмове ўзаемадзеяння навучальнай установы і прадпрыемстваў. Педагагічны калектыў ПТВ №224 сумесна з прадпрыемствамі гандлю і грамадскага харчавання праводзіць мэтанакіраваную работу па ўдасканаленні навучальна-выхаваўчага працэсу, умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы, падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў. Актыўнае супрацоўніцтва наладжана з Гомельскім гарадскім і Рэчыцкім цэнтрамі занятасці. Для гэтага ў нашай навучальнай установе функцыянуе вячэрняе аддзяленне, дзе пастаянна навучаецца больш за 100 чалавек. Па дагаворах з прадпрыемствамі гандлю вядзецца перападрыхтоўка спецыялістаў адпаведнага профілю".

Улічваючы спецыфіку прафесій і цяжкасці, звязаныя з арганізацыяй вытворчай практыкі, кожны год па галоўным упраўленні спажывецкага рынку і паслуг Гомельскага аблвыканкама выдаецца загад "Аб замацаванні базавых прадпрыемстваў горада Гомеля для вытворчага навучання і практыкі навучэнцаў Гомельскага ПТВ №224 гандлю", дзе за вучылішчам замацоўваецца каля 60 прадпрыемстваў, з іх 37 магазінаў харчовых і 8 — нехарчовых тавараў, 15 прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

Прыемна адзначыць, што многія кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў з'яўляюцца выпускнікамі ПТВ-224: магазін "Дабрабыт" узначальвае В.Сакунова; магазін "Зубр" — Л.Назарава; рэстаран "Зара" — В.Кузняцова і многія іншыя.

На ўсіх вучэбна-вытворчых прадпрыемствах ёсць вучэбныя класы, аснашчаныя неабходным абсталяваннем, інвентаром, інструментамі. На ўроках вытворчага навучання падлеткі працуюць пераважна з натуральнымі ўзорамі. Чаргаванне тэорыі і практыкі ажыццяўляецца на працягу ўсяго навучальнага года згодна з графікам навучальнага працэсу. Майстры вытворчага навучання поўны рабочы дзень праводзяць на прадпрыемствах. Да правядзення інструктажу прыцягваюцца работнікі магазінаў — настаўнікі. Яны непасрэдна на рабочых месцах вучаць набываць прафесійныя навыкі гандлёвага майстэрства. Усе навучэнцы працуюць на аплачваемых рабочых месцах, што дае магчымасць вучылішчу выконваць эканамічную праграму. Так, за 1999 год звыш плана зароблена 3694 тысячы рублёў, у 2000 годзе — 14921 тысяча рублёў, а за тры месяцы 2001 года — 13 мільёнаў рублёў. Для аказання дапамогі і адпаведнага кантролю па арганізацыі навучання і выхавання навучэнцаў на кожным прадпрыемстве створана такая эфектыўная форма работы, як вучэбна-вытворчы савет. Па заканчэнні вучылішча 97 працэнтаў навучэнцаў працаўладкоўваюцца па адпаведным профілі.

У рабоце калектыву ПТВ-224 Гомеля яскрава прасочваецца сістэмнасць, прадуманасць у арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, заснаваныя на аналізе педагагічнай дзейнасці і дасягнутых выніках.

Супрацоўніцтва вучылішча і базавых прадпрыемстваў па навучанні і выхаванні навучэнцаў дапамагае распрацоўваць сумесныя мерапрыемствы, такія як конкурсы "Лепшы па прафесіі" паміж работнікамі магазінаў і навучэнцамі, мастацкай самадзейнасці, кірмашы, выставы-продажы, вечары-сустрэчы выпускнікоў і навучэнцаў па тэме "Любі сваю прафесію, ганарыся ёю", канферэнцыі "Хлеб — усяму галава", спартыўныя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, валейболе, футболе, тэнісе і іншых відах спорту; ажыццяўляць падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых для прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання; эфектыўна арганізоўваць працэс вытворчага навучання (без бюджэтных асігнаванняў); дакладна і хутка вызначаць рабочыя месцы для праходжання навучэнцамі вытворчай практыкі (100-працэнтная аплата); своечасова і якасна рыхтаваць вучэбныя кабінеты вучылішча і класы ў магазінах, рэстаранах да новага навучальнага года; сістэматычна набываць новае гандлёвае абсталяванне; выконваць эканамічную праграму; мець дадатковыя крыніцы фінансавання навучальна-выхаваўчага працэсу; ажыццяўляць працаўладкаванне навучэнцаў.

У працэсе работы прысутныя азнаёміліся з паказам рэкламы харчовых і нехарчовых тавараў, які праходзіў пад дэвізам "Гандаль — справа тонкая", фрагментамі конкурсу прафесійнага майстэрства па тэме "Сервіроўка тэматычных сталоў" пад назвамі "Алена", "Міленіум", відэафільма, зазнятага падчас правядзення ўрока вытворчага навучання на базавым прадпрыемстве і ўрока па спецтэхналогіі, распрацаванага выкладчыкам А.Зярновай, дзе навучэнцы выконвалі ролі адвакатаў, прысяжных засядацеляў, экспертаў; прэзентацыі кваліфікацыі "Афіцыянт".

Падчас абмену думкамі дырэктары прафесійна-тэхнічных вучылішчаў П.Варабей, Р.Шубіч, В.Качко далі высокую ацэнку рабоце калектыву ПТВ-224. В.Бяспалы, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку і паслуг Гомельскага аблвыканкама, адзначыў важную ролю супрацоўніцтва калектыву ПТВ-224 з базавымі прадпрыемствамі, якое дае магчымасць вырашаць праблемы па забеспячэнні магазінаў кваліфікаванымі спецыялістамі, пра што сведчаць лічбы: да 70 працэнтаў выпускнікоў вучылішча працуюць у гандлёвых прадпрыемствах Гомеля.

Падвёў вынікі работы Андрэй Васільевіч Лук'яновіч, начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама, які адзначыў, што ва ўсёй творчай справаздачы прысутнічала самае галоўнае — прыгажосць: прыгажосць арганізацыі ўрокаў, афармлення матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння і комплексна-метадычнага забеспячэння базы вучылішча, стварэння рэкламы і г.д. Андрэй Васільевіч падзякаваў калектыву інжынерна-педагагічных работнікаў ПТВ-224 за плённую працу і асабіста Л.Жабскай за велізарны ўклад у развіццё сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Заўважу, што дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву ў ПТВ-224 назіраецца стабільнасць кадраў, многія з якіх працуюць ужо шмат гадоў.

Педагогі творча ставяцца да работы, вялікую ўвагу надаюць эстэтычнаму афармленню кабінетаў, захаванасці матэрыяльных каштоўнасцяў, уласнымі сіламі ствараюць наглядныя дапаможнікі (плакаты, раздатачны матэрыял, стэнды). Для эфектыўнасці работы кожны кабінет аснашчаны тэлевізарам, відэамагнітафонам. Ёсць уласная відэатэка. На відэастужку запісваюцца цікавыя падзеі з жыцця калектыву (адкрытыя ўрокі, класныя гадзіны, спартыўныя мерапрыемствы), што служыць выдатным матэрыялам для абагульнення і ўкаранення перадавога педагагічнага вопыту. Работнікі знаходзяцца ў пастаянным пошуку новых формаў і метадаў арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу і рэалізацыі пастаўленых перад калектывам задач па падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў. Для якаснага засваення матэрыялу выкладчыкі і майстры вытворчага навучання ўжываюць у сваёй рабоце разнастайныя формы правядзення ўрокаў.

Прыемна адзначыць, што ПТВ-224 — адно з першых вучылішчаў у вобласці, дзе пачала функцыянаваць псіхалагічная служба. Сёння навучальна-выхаваўчы працэс у вучылішчы арганізоўваецца з улікам індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцяў навучэнцаў. Пытаннямі выяўлення асноўных параметраў асобы займаецца педагог-псіхолаг Г.Атрохава. Адным з накірункаў дзейнасці псіхалагічнай службы з'яўляецца псіхадыягностыка, якой тут надаецца значная ўвага. Праводзяцца псіхалагічныя абследаванні навучэнцаў з мэтай выяўлення ўзроўняў (таварыскасці, сфарміраванасці памяці, агрэсіўнасці, канфліктнасці) і вызначэнне стылю канфліктнага рэагавання, наяўнасць і ступень сфарміраванасці творчага патэнцыялу і інш. На аснове атрыманых даных псіхолаг будуе сваю работу па псіхадукацыі і псіхакарэкцыі.

Усё дасягнутае — вынік мэтанакіраванай працяглай дзейнасці калектыву педагагічных работнікаў пад умелым кіраўніцтвам дырэктара ПТВ-224 Л.Ф.Жабскай. Напярэдадні 55-годдзя хочацца пажадаць усім работнікам гэтай навучальнай установы творчых поспехаў у падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў.

Алена АЛЯКСЕЕНКА,
намеснік дырэктара Гомельскага абласнога вучэбна-метадычнага цэнтра прафесійнай адукацыі.

ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКА!

Адпаведна дагаворам, заключаным з рэдакцыямі (выдавецтвамі), пры афармленні падпіскі прадпрыемствы сувязі ажыццяўляюць пасрэдніцкія паслугі па распаўсюджванню і дастаўцы, таму за нявыхад, несвоечасовы выхад з друку газет і часопісаў адказнасць перад падпісчыкам нясе рэдакцыя (выдавецтва).

Праверце правільнасць афармлення абанемента, на абанеменце павінен быць пастаўлены адбітак касавай машыны. Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанеменце ставіцца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету ці часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай картачкай запаўняецца падпісчыкам чарнілами, разборліва, без скарачэнняў, у адпаведнасці з умовамі каталога.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі "ПВ-МЕСЦА" выконваецца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

Дзяржаўнае пытанне

Аб заканадаўчай падтрымцы адукацыі

Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе актыўна ўключылася ў работу па новым заканадаўчым рэгуляванні нацыянальнай сістэмы адукацыі ва ўмовах яе рэфармавання.

ЗГЭТАЙ мэтай камісіяй было праведзена выязное пасяджэнне на базе ўстаноў прафтэхадукацыі Мінска з парадкам дня аб канцэпцыі развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і прававым рэгуляванні галіны.

У сустрэчы бралі ўдзел начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства адукацыі Эдуард Мікалаевіч Ганчар, начальнік упраўлення адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл Сяргеевіч Ціцянкоў, рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзь Ханонавіч Шкляр, дырэктары ПТНУ сталіцы.

Першай прафтэхустановай, якая сустрэла прадстаўнічую дэлегацыю, стала мінскае ПТВ № 9 машынабудавання, якое ўзначальвае Аляксандр Куўшыннікаў. Дырэктар падрабязна азнаёміў гасцей з гісторыяй і сучасным станам вучылішча, была прадстаўлена вучэбна-матэрыяльная база, адбылося знаёмства дэпутатаў з калектывам установы.

Вучылішчу ўжо 55 гадоў, і яго гісторыя непарыўна звязана з Мінскім аўтамабільным заводам, які па-ранейшаму застаецца апорай для ўстановы. Ён аказвае матэрыяльную і фінансавую падтрымку, паслугі ў сацыяльнай сферы. Штомесячна аўтамабільны завод выдзяляе розныя інструменты і прыстасаванні на суму 500 тысяч рублёў. У васьмі майстэрнях вучылішча ўстаноўлена 180 адзінак абсталявання для металаапрацоўкі і электрагазазваркі. На жаль, большасць яго патрабуе замены, бо маральна і фізічна састарэла. Але абнавіць вучэбную базу пакуль не пад сілу вучылішчу. Завод дапамагае толькі ў рамонце станкоў. Для гэтага выдзелены дзве стаўкі слесара-рамонтніка і адна стаўка токара. У хуткім часе будуць адрамантаваны чатыры фрэзерныя і два такарныя станкі. Не парываюцца сувязі прадпрыемства і вучылішча і пры праходжанні вытворчай практыкі навучэнцаў. Са свайго боку прафтэхвучылішча застаецца асноўным пастаўшчыком кадраў для МАЗа. Кожны год выпуск складае 300 чалавек, большасць з якіх накіроўваецца ў заводскі калектыў. Установа працуе з прадпрыемствам на дагаворнай аснове, таму вострых пытанняў у працаўладкаванні пакуль не паўстае.

Дэпутаты былі азнаёмлены і з выхаваўчым працэсам установы, яны наведалі выставу тэхнічнай і мастацкай творчасці выхаванцаў, а таксама музей баявой і працоўнай славы. З тысячнага кантынгенту навучэнцаў 700 чалавек наведваюць гурткі і секцыі па інтарэсах. Для больш здольнай моладзі прадугледжана дамоўленасцямі далейшае навучанне ў аўтамеханічным тэхнікуме і політэхнічным каледжы.

Былі таксама шырока прадстаўлены пазабюджэтная дзейнасць установы і новыя шляхі яе далейшага развіцця.

Разнастайную праграму для дэпутатаў прадставіла Мінскае вышэйшае прафесійнае вучылішча электронікі, якім кіруе Валерый Хасін. Створанае ў 1966 годзе вучылішча працуе сёння ў рэжыме вышэйшага, што забяспечвае двухзроўневую падрыхтоўку маладых спецыялістаў. Цяпер на першай ступені займаюцца 1200 навучэнцаў, лепшыя 220 чалавек атрымліваюць кваліфікацыю тэхніка з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Навукаёмістая вытворчасць, высокія тэхналогіі электроннай прамысловасці патрабуюць сучаснага камп'ютэрнага аснашчэння ўстановы, перадавых тэхналогій навучання і выхавання. Гэта дазволіць рыхтаваць спецыялістаў названай галіны на высокім узроўні, што будзе адпавядаць сучасным патрабаванням рынку працы.

Сёння ВПВ электронікі крочыць па шляху інавацыйных працэсаў у прафтэхадукацыі, знаходзіцца ў пошуку аптымальных прыёмаў асваення прафесіі. Гэта было яскрава прадэманстравана ў час наведання дэлегацыяй майстэрні аператараў мікразваркі, дзе навучэнцы засвойваюць прафесійныя навыкі на камп'ютэрных трэнажорах, праграмы якіх імітуюць тэхналагічны мікразварачны працэс. Шырока выкарыстоўваюцца тут пры навучанні і вучэбныя відэафільмы, створаныя самімі ж навучэнцамі.

Быў прадстаўлены офіс сакратароў-рэферэнтаў, дзе навучэнцы спасцігаюць азы адміністравання ў кіраўніцкай дзейнасці, пры гэтым выкарыстоўваюцца сучасная аргтэхніка, новыя тэхналагічныя прыёмы, у тым ліку дзелавыя ролевыя гульні.

Вялікую цікавасць выклікаў у прысутных экаофіс, у якім "сустракаюцца" веды па фізіцы, хіміі, біялогіі і замежнай мове і які з'яўляецца цэнтрам фарміравання экалагічнай культуры.

Былі паказаны вынікі рэалізацыі педагагічных праектаў па камп'ютэрызацыі вучэбнага працэсу на прыкладах класаў камп'ютэрных тэхналогій, у прыватнасці кабінета вылічальнай тэхнікі для наладчыкаў тэхналагічнага абсталявання, дзе навучэнцы мадэлююць рабочы працэс на камп'ютэры, а таксама кабінета інфармацыйных тэхналогій, зарыентаваных на будучых сакратароў-рэферэнтаў.

Характэрна, што навучанне і выхаванне знітавана тут у адзінае цэлае і кожны вучэбны кабінет установы ўяўляе сабой цэнтр выхаваўчай работы. Развіццю нацыянальнай свядомасці навучэнцаў, выхаванню іх годнасці ва ўстанове надаецца вялікае значэнне.

Вельмі ўражлівым было наведанне этнаграфічнага цэнтра. Ухвальна, што ва ўстанове вельмі беражліва захоўваюць нацыянальную культуру, адраджаюць беларускія рамёствы. Гордасцю ўстановы стала адкрыццё музея У.Караткевіча, дзе прадстаўлены біяграфічныя звесткі пра пісьменніка, яго першыя публікацыі, шматлікія літаграфіі. Ужо распрацаваны новыя педагагічныя тэхналогіі па выкарыстанні экспанатаў музея ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў.

На базе Вышэйшага прафесійнага вучылішча электронікі адбылося пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе на чале са старшынёй Ігарам Васільевічам Катляровым з кіруючымі работнікамі прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Пра стан, канцэпцыю развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі і аб прапановах па прававым рэгуляванні галіны расказаў у сваім выступленні Эдуард Мікалаевіч Ганчар.

АСНОЎНАЯ ўвага выступоўцы была скіравана на шэраг праблем, якія застаюцца пакуль нявырашанымі. Адной з найбольш вострых з'яўляецца праблема забеспячэння педагагічнымі кадрамі ў сістэме прафтэхадукацыі. Прычына такога становішча — нізкая заработная плата як выкладчыкаў, так і майстроў вытворчага навучання. Па гэтым пытанні трэба прымаць самыя неадкладныя меры. Інакш праз бліжэйшыя пяць гадоў увогуле не застанецца спецыялістаў, якія забяспечваюць сёння не толькі высокі ўзровень кваліфікацыі выпускнікоў, але і павышэнне прафесійнага майстэрства маладых выкладчыкаў і майстроў вытворчага навучання.

Апошнім часам знайшла частковае вырашэнне праблема матэрыяльна-тэхнічнай аснашчанасці ПТНУ. Многія вучылішчы ўжо набылі сельгастэхніку, угнаенні і інш. на тых жа ўмовах, што і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы.

Былі зроблены адпаведныя захады па адшуканні дадатковых сродкаў з бюджэту і пазабюджэтных крыніц.

Безумоўна, выклікае заклапочанасць тэндэнцыя зніжэння ўзроўню бюджэтнага фінансавання ПТНУ. У структуры расходаў на ўтрыманне ўстаноў прафтэхадукацыі расходы на набыццё абсталявання знізіліся да аднаго працэнта. Па той жа прычыне не вырашаюцца праблемы вырабу сродкаў навучання, трэнажорнага і іншага абсталявання, выпуску падручнікаў і дапаможнікаў.

Трэба ўлічваць і тое, што больш паловы навучальных устаноў увогуле не маюць дадатковых сродкаў, акрамя бюджэтных. Тая частка сродкаў, якая паступае сёння ад арганізацый — заказчыкаў кадраў, складае менш аднаго працэнта.

Гэтае становішча спраў яшчэ раз пацвярджае, што існуючыя палажэнні заканадаўчых актаў не стымулююць удзел арганізацый і прадпрыемстваў ва ўмацаванні вучэбна-матэрыяльнай базы ПТНУ.

Па-ранейшаму застаецца нявырашаным пытанне замацавання выпускнікоў на прадпрыемствах, асабліва там, дзе ўкладваліся адпаведныя сродкі для арганізацыі практычнага навучання. Магчыма, трэба выкарыстоўваць у гэтым плане замежны вопыт — прагназаванне новых сфер дзейнасці, распрацоўка усебаковых кваліфікацыйных патрабаванняў (у адрозненне ад нашых тарыфна-кваліфікацыйных характарыстык), распрацоўка прававых норм, якія значна павышаюць ролю індывідуальных дагавораў на падрыхтоўку кадраў, якія стымулююць прадпрыемствы прымаць на практыку навучэнцаў у большай колькасці, чым патрэбна для абнаўлення і развіцця кадравага патэнцыялу.

Галоўным на сённяшні дзень застаецца падрыхтоўка праектаў нарматыўных прававых актаў, якія б стваралі ўмовы для развіцця сістэмы ПТА і паляпшэння яе ўзаемадзеяння з сацыяльна-эканамічным комплексам, распрацоўка ў бягучым годзе праекта Закона Рэспублікі Беларусь "Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

Мяркуецца, што змест Закона закране менавіта тыя заканадаўчыя нормы, якія адлюстроўваюць спецыфіку прафтэхадукацыі.

Неабходна, у прыватнасці, больш дэталёва прапісаць тыя нормы, якія б забяспечвалі доступ да ПТА моладзі, дзяржаўныя гарантыі правоў грамадзян на атрыманне адукацыі дадзенага ўзроўню. Трэба ў заканадаўчым парадку вырашыць пытанні, звязаныя з праблемамі развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва сферы адукацыі і наймальнікаў кадраў, забеспячэння сацыяльнага партнёрства ў мэтах удасканалення прафесійна-кваліфікацыйнай структуры кадраў, фарміравання сацыяльнага заказу, ацэнкі якасці падрыхтоўкі кадраў.

Мэтазгодна больш увагі звярнуць на арганізацыю прафесійнага навучання кадраў індывідуальным дагаворам па тыпу "навучэнец — прадпрыемства — навучальная ўстанова", што ў значнай меры павысіла б адрасаванне і эфектыўнасць прафесійнага навучання. Што тычыцца вырашэння іншых пытанняў, то яны павінны быць уключаны ў кампетэнцыю цэнтральных і рэгіянальных органаў кіравання як адукацыяй, так і галінамі эканомікі, альбо можна стварыць адпаведныя міжведамасныя структуры.

Трэба зазначыць, што важнейшай задачай сёння з'яўляецца неабходнасць прыцягнення інвестыцыйных сродкаў шляхам шматканальнага фінансавання, у тым ліку далучэння вытворчай сферы рэспублікі да ўдзелу ў фінансаванні ПТА, развіцці і абнаўленні матэрыяльна-тэхнічнай базы яе навучальных устаноў, арганізацыі і правядзенні практычнага навучання.

Для гэтага трэба стварыць такі механізм эканамічнага стымулявання дзейнасці прадпрыемстваў па развіцці прафтэхадукацыі, які б быў падмацаваны заканадаўчымі нормамі. Некаторыя з іх неабходна ўвесці ў дзеючыя Законы "Аб прадпрыемстве", "Аб падаткаабкладанні" і інш. Аднак асобныя палажэнні павінны быць прапісаны і ў праекце Закона "Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі". Гэты дакумент можа стаць важнейшым інструментам правядзення адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якая будзе ажыццяўляць кадравую падтрымку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у краіне.

Праект Закона ў канчатковым выніку набудзе сацыяльна-асобасную накіраванасць, будзе абараняць правы і інтарэсы чалавека, ствараючы ўмовы і магчымасці для прыстасавання любога грамадзяніна да змяненняў на рынку працы, да росту прэстыжу і статусу рабочых прафесій шляхам іх свабоднага і раўнапраўнага выбару.

ПРАБЛЕМЫ прафтэхадукацыі сённяшняга дня выклікалі вялікую заклапочанасць дэпутатаў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе. Была выказана прапанова аб цесным узаемадзеянні парламентарыяў і кіруючых органаў прафтэхсістэмы ў выпрацоўцы адзіных падыходаў у яе заканадаўчай базе.

Ала КЛЮЙКО.

Псіхалагічны практыкум

Хочаш пераканаць — умей аргументаваць

Нашы ўзаеміны вельмі рознабаковыя і часта бываюць не толькі асабістымі, жаданымі, але і афіцыйнымі, носяць дзелавы характар. Гэта могуць быць сустрэчы і гутаркі кіраўнікоў і падначаленых, публічныя выступленні і г.д. І ў такіх выпадках неабходна карыстацца асаблівымі захадамі, якія паляпшаюць разуменне і ўзаеміны.

Напярэдадні сустрэчы, незалежна ад таго, хто яе ініцыятар, трэба абавязкова праверыць сваю гатоўнасць да яе. Запытацца ў сябе, якую галоўную мэту я стаўлю перад сабой у размове. Гэта варта дакладна ведаць, каб не адхіляцца на другарадныя задачы.

Адкажыце сабе, ці можна абысціся без гэтай размовы. Чым важней гутарка, тым больш старанна да яе трэба падрыхтавацца. Падумайце, як паставіцца да намечанай сустрэчы суразмоўца, калі вы заўважылі, што пры папярэдняй дамове ён быў незадаволены ці здзівіўся і можна чакаць ад яго адмоўнай установкі на сустрэчу. Важна запытацца ў сябе, ці ўпэўнены я ў спрыяльным зыходзе размовы, якіх перашкод можна чакаць? Калі вынік сустрэчы не будзе задавольваць мяне, што яшчэ можна змяніць, ці можна пайсці на кампраміс? Такіх пытанняў можна задаць сабе шмат, галоўнае, каб яны дапамаглі настроіцца на сустрэчу, правесці яе з жаданым вынікам.

Падчас гутаркі задавайце сваё першае пытанне так, каб яно было кароткім, цікавым, але не дыскусійным (спрэчным). Пажадана, каб гэта было пытанне, на якое ваш суразмоўца адкажа толькі станоўча. Нельга пачынаць гутарку з адмаўлення. У дзелавой размове трэба выкладаць свае думкі коратка, абавязкова абгрунтоўваць меркаванні. Калі доказы будуць больш пераканаўчымі, тым хутчэй пагодзіцца з вамі суразмоўца. Не рэкамендуецца ўжываць словы з двайным значэннем.

Калі суразмоўца не згаджаецца з вамі, выслухайце яго да канца (ён будзе раздражнёны, калі яго спыняюць, прычым на самым галоўным); ніколі не спяшайцеся з адказам, пакуль не зразумееце сутнасць пярэчанняў (уласная эмацыянальнасць можа вас сур'ёзна падвесці); пасля гутаркі трэба запытацца ў сябе пра свае пачуцці, пра свае дапушчаныя падчас дзелавой размовы памылкі, аб тым, што вы зрабілі правільна. Варта запытацца ў сябе, якое ўвогуле ўражанне вы зрабілі падчас гутаркі.

Характэрныя памылкі, якія перашкаджаюць канструктыўнай размове.

Здараецца, людзі лёгка пераходзяць на крык, калі не могуць растлумачыць штосьці іншаму. Эфектыўнасць крыку роўная нулю. І гучна — зусім не значыць больш зразумела.

Калі ж вам цяжка данесці сваю думку да суразмоўцы, то спачатку звярніце ўвагу на яе знешнія бакі. Напрыклад, на інтанацыю. Ужо адно тое, што вы ўмела выкарыстоўваеце адны толькі паўзы і мадуляцыі голасу, значна павышае выразнасць мовы.

Важна звяртаць увагу на тое, каб у мове ў вас не паяўляліся бессэнсоўныя выклічнікі і словы накшталт "ну", "э-э-э", "гэта" і г.д. Яны вельмі раздражняюць, перашкаджаючы зразумець сутнасць вашай думкі, а таму іх трэба ліквідаваць.

Словы, дарэчы, маюць магічную сілу. Гэта магутная зброя, з якой вы эканоміце нервовую энергію і набываеце моцны сродак уздзеяння, здольнасць унушаць свае думкі. Дарэчы, прысутнасць у слове галоснага "і" стварае ўражанне чагосьці маленькага, вузкага, нязначнага. Параўнайце словы "пім" і "пум". Імя "Лі" звычайна выбіраюць для самай маленькай фігуркі, а "Лай" — для самай вялікай.

Калі мы выкарыстоўваем у мове словы, сэнс якіх зразумелы, гэта павышае "ўнушальнасць" мовы, а калі выкарыстоўваем словы з абстрактным сэнсам, — памяншае яе. Напрыклад, словы тыпу нечаканасць, бляск, святло, мякка, спакойна, страшна, давай і інш. выклікаюць у нас нейкі эмацыянальны водгук. І, наадварот, словы значыць, штодзённа, у выніку, населены пункт, устанаўленне — рацыянальныя, сухія і памяншаюць унушальнасць.

Гэтыя асаблівасці мовы можна выкарыстаць і ў дзелавой гутарцы і старацца ўжываць часцей словы з эмацыянальным адценнем.

Акрамя ўсялякага роду дзелавых размоў, нам даводзіцца часам, а многім і часта, публічна выступаць. Сітуацыя гэта даволі распаўсюджаная, але выклікае цяжкасці і стрэсы ў тых, хто не валодае мастацтвам выступаць публічна, уменнем трымацца перад аўдыторыяй.

Зразумела ж, аратарскае мастацтва складанае і ўключае ў сябе вельмі шмат розных нюансаў. Але ёсць некалькі нескладаных правілаў, дзякуючы якім можна пазбегнуць вельмі грубых памылак і дасягнуць поспеху.

Пры публічным выступленні важна і тое, як знешне выглядае чалавек, як ён павітаў аўдыторыю, як ён валодае тэмай гутаркі (калі вы некампетэнтны ў нейкім пытанні, лепш не выступаць).

Калі ёсць магчымасць, даведайцеся перад выступленнем пра саставаўдыторыі, яе інтарэсы. Дапамагае планаванне выступлення, гэта сістэматызуе мову; прыклады, графікі, табліцы, якія дэманструюцца па ходу выступлення, дапамагаюць больш дакладна ўспрымаць думкі.

Добра, калі вы не карыстаецеся запісамі падчас выступлення, а гаворыце свабодна, тады ствараецца больш даверлівая атмасфера. Ускладняе слуханне выкарыстанне шматлікіх жэстаў.

А дапамагае — усмешка. Людзі заўсёды станоўча рэагуюць на яе. Здымае напружанне жарт, але калі вы яго выкарысталі, трэба старацца не аддалядца ад сур'ёзнай размовы. І яшчэ, напрыканцы выступлення пажадана прывесці цікавы факт, які ўражвае. Пачатак і канец любога паведамлення ці размовы заўсёды павінны быць яркімі.

Вядома ж, гэта не ўсе пажаданні для выступоўцаў. Кожны выбірае свой тып узаемінаў (адпаведна са сваім тэмпераментам, характарам, індывідуальнымі і асобаснымі запытамі).

Дарэчы, амаль усіх выступоўцаў можна падзяліць на дзве групы.

Выступоўца, які адносіцца да першай групы, быццам падпарадкоўвае сабе аўдыторыю. Ён улічвае непасрэдную рэакцыю слухачоў, але трымае "лейцы" ў сваіх руках. Не дапускае вольнасцяў, жартаў у мове і ў паводзінах. Яго можна назваць "аўтарытарным".

Выступоўца другой групы сам у нейкай ступені падпарадкаваны аўдыторыі. У яго могуць быць розныя варыянты паводзін, узаемін і мовы. Усё залежыць ад канкрэтнай сітуацыі, ён арыентуецца на непасрэдную рэакцыю аўдыторыі. У яго больш "гібкая", "асобасная" манера ўзаемін з ёю. Гэта "дэмакратычны" лектар.

У аднаго і другога ёсць свае добрыя рысы і свае недахопы. Калі лектар вельмі залежны, ён можа не адчуваць запытаў слухачоў, што прыводзіць да страты ўвагі. Здараецца, лектар так захоплены сваёй прамовай, што не заўважае таго, як яго ўспрымаюць. А калі ж штосьці незразумела ці нецікава, людзі і не слухаюць. А калі лектар імкнецца ва ўсім ісці за аўдыторыяй, задаволіць усіх, то часам можа страціць аўтарытэт, і эфектыўнасць выступлення будзе зніжана.

Таму ўсё залежыць ад тыпу асобы выступоўцы (як ён умее сябе падаць), ад жаданняў і запытаў слухачоў. І ўсё ж кожны выступоўца павінен памятаць аб тым, што слова — "вялікая зброя жыцця, і акрамя таго, "яно раўназначнае кулі. Больш за тое, куляй у аднаго трапіш, а трапным словам — у тысячу" (І.Гурскі).

Аксана ЖУРАЎСКАЯ,
псіхолаг
Гродзенскага вучылішча мастацтваў.

Моладзь і час

Каб не піў, не курыў...

Сёння ад нашай моладзі можна пачуць самыя розныя меркаванні. Бывае нават цяжка вызначыць, якія думкі пераважаюць. Каб высветліць сапраўдныя меркаванні моладзі і атрымаць найбольш свежую інфармацыю для размовы, я правёў сацыялагічнае даследаванне сярод навучэнцаў Полацкага педагагічнага каледжа. Мяне цікавілі пытанні сямейна-шлюбных адносін. І мне здаецца, атрыманы карысныя звесткі, якія ўяўляюць цікавасць і для маіх калег.

У прыватнасці, я паспрабаваў высветліць, якімі хацелі б бачыць будучых жонку і мужа хлопцы і дзяўчаты. Ім было прапанавана з трыццаці дзвюх якасцей выбраць сем найбольш важных.

Такім чынам, хлопцы захацелі бачыць сваю будучую жонку з наступнымі якасцямі (у парадку перавагі): вернасць, прыгажосць, розум, сумленнасць, ахайнасць, уменне весці хатнюю гаспадарку, чуласць.

Дзяўчаты хацелі б, каб у будучага мужа былі наступныя якасці: розум, вернасць, сумленнасць, здароўе, чуласць, не злоўжывае спіртнымі напоямі, не ўжывае наркотыкі.

Як бачым, на першыя месцы навучэнцы паставілі такія якасці, як вернасць, розум, сумленнасць, чуласць. І вельмі добра, што яны высока ставяць менавіта іх.

Звяртае на сябе ўвагу тое, што хлопцы і дзяўчаты ў некаторых ацэнках разышліся. Хлопцы такую якасць, як розум, у будучай жонкі паставілі на трэцяе месца, а вось дзяўчаты — на першае.

Хлопцы палічылі, што добрая жонка павінна быць акуратнай, умела весці хатнюю гаспадарку. Дзяўчатам трэба задумацца над гэтым, бо калі прыгажосць чалавеку дае прырода, то гэтыя якасці можна і трэба набываць.

Многія з навучэнцаў хацелі б, каб будучыя муж і жонка не злоўжывалі спіртнымі напоямі, не ўжывалі наркотыкі. Асабліва занепакоены дзяўчаты. Не выпадкова на шостае і сёмае месцы яны паставілі менавіта гэтыя якасці будучага мужа. П'янства і наркаманія пакуль менш распаўсюджаны сярод дзяўчат і жанчын, таму хлопцы паставілі гэтыя якасці будучай жонкі на больш нізкія месцы.

Практычна праігнаравалі навучэнцы такія з прапанаваных якасцей, як: добра танцуе, з вёскі, з горада, аднолькавыя палітычныя погляды.

У ранейшыя часы беларусы пры выбары нявесты кіраваліся найперш тым, каб дзяўчына была добрай працаўніцай, не мела кепскай славы, вызначалася здароўем, паходзіла з роўнай або багацейшай сям'і. І калі навучэнцы ставяць на высокае месца здароўе (дзяўчаты — на чацвёртае, а хлопцы — на восьмае), тут іх пазіцыя супадае з пазіцыяй нашых продкаў.

Цікава, што такую якасць будучага мужа, як бачыце, дзяўчаты паставілі вельмі высока — на восьмае месца, а хлопцы — толькі на шаснаццатае. Відаць, хлопцы разлічваюць, што яны самі заробяць грошы. Калі яно так, то гэта ўхвальна.

На думку дзяўчат, будучаму мужу такая якасць, як сціпласць, не вельмі патрэбна (толькі дваццатае месца), а вось хлопцы гэту якасць у будучай жонкі цэняць больш (трынаццатае месца).

Хлопцы не хацелі б, каб будучая жонка курыла (дванаццатае месца). Дзяўчаты паставіліся больш цярпіма да курэння мужа (васемнаццатае месца).

Дзяўчаты цэняць вопытнасць мужа ў сексе (адзінаццатае месца). Хлопцы паставілі гэту якасць на пятнаццатае месца.

Аналіз адказаў хлопцаў і дзяўчат дае вельмі добрую магчымасць педагогу пераконваць навучэнцаў, не навязваючы сваіх поглядаў, спасылаючыся на тое, што так лічаць іх сябры і сяброўкі. Яны не пагаджаюцца, яны абураюцца, але з грамадскай думкай свайго асяроддзя моладзь лічыцца.

Трэба адзначыць, што адказы на пытанні анкеты дэманструюць супярэчлівасць уяўленняў моладзі. Напрыклад, большасць з навучэнцаў (68 працэнтаў хлопцаў і 59 працэнтаў дзяўчат) станоўча ставіцца да так званага грамадзянскага шлюбу. Толькі 14 працэнтаў хлопцаў і 19 працэнтаў дзяўчат — адмоўна. 18 працэнтаў і 22 працэнты дзяўчат не змаглі адказаць на гэта пытанне.

У той жа час большасць навучэнцаў (64 працэнты хлопцаў і 71 працэнт дзяўчат) лічыць неабходным асвяціць свой шлюб у царкве, касцёле і г.д. 14 працэнтаў хлопцаў і 16 працэнтаў дзяўчат адзначылі, што яны да гэтага не будуць імкнуцца. 22 працэнты хлопцаў і 13 працэнтаў дзяўчат не змаглі адказаць на пытанне. Гэта вельмі істотныя змяненні ў настроях людзей і ў нашым жыцці. У савецкі час вянчанне ў царкве або касцёле было рэдкай з'явай. Але ж царква катэгарычна адмоўна ставіцца да так званага грамадзянскага шлюбу.

Вельмі эмацыянальную рэакцыю выклікае ў дзяўчат знаёмства з адказамі хлопцаў на пытанне "Як вы паставіцеся да таго, калі даведаецеся, што ваша абранніца да шлюбу мела інтымныя адносіны з іншымі?"

Пераважная большасць дзяўчат (74 працэнты) паставілася без негатыву да таго, што будучы муж меў інтымныя адносіны з другімі да шлюбу, адзначыўшы, што ўспрымаюць гэта з разуменнем, паколькі "мы сучасныя людзі". З хлопцаў гэту пазіцыю падзяляе 46 працэнтаў. Але 8 працэнтаў хлопцаў занялі катэгарычна адмоўную пазіцыю, адзначыўшы, што яны паставяцца да гэтага вельмі адмоўна і з такой жонкай жыць не будуць. Вось гэта і выклікае абурэнне дзяўчат. Тут ёсць пра што пагаварыць.

Цікавыя меркаванні выказалі навучэнцы па такіх праблемах, як прастытуцыя, гомасексуалізм, нараджальнасць і аборты; мэтазгоднасць абавязковай праверкі перад шлюбам на наяўнасць спадчынных і венерычных хвароб і па іншых пытаннях.

Атрыманы матэрыял сведчыць пра тое, што патрэбна карэкціроўка поглядаў моладзі на сямейна-шлюбныя адносіны.

Вадзім ЦІТОЎ,
выкладчык
Полацкага педагагічнага каледжа.

"Вікінгі" пабывалі ў Мінску

Днямі ў сталічнай школе № 185 пабывалі вучні і настаўнікі адной са школ нарвежскага горада Левангер. Ужо год школьнікі абедзвюх краін ажыццяўляюць сумесны праект "Вікінгі".

Ідэя нарадзілася летась у маі, калі ў 185-ю школу з мастацкім ухілам прыехала дэлегацыя з Нарвегіі. Гэта было выпадкова, таму што напачатку ў нарвежцаў былі іншыя мэты. Але штосьці ў іх там не атрымалася, а школа № 185 была якраз па дарозе. Тое, што змаглі паказаць на хуткую руку мінскія школьнікі, гасцям вельмі спадабалася. І рэальнай асновай для далейшага супрацоўніцтва стаў праект "Вікінгі", які прадугледжвае вывучэнне культур двух народаў праз мастацкую творчасць дзяцей.

Цяпер нарвежцы прыехалі амаль усёй школай, якая з'яўляецца альтэрнатыўнай і дзе працуюць пяць настаўнікаў і вучацца ўсяго шасцёра дзяцей. Дырэктар Труге Нільсан даў мінскім школьнікам цікавы ўрок геаграфіі Нарвегіі і гісторыі вікінгаў, а азнаёміўшыся са школай № 185, між іншым сказаў:

— Нам вельмі цікава наведаць беларускія школы, якія гэтак моцна адрозніваюцца ад нарвежскіх па спосабе адукацыі. Тут усе заклапочаны лепшымі поспехамі ў вучобе, нас жа цікавіць паралельна мноства іншых рэчаў. Хаця 185-я школа, на наш погляд, у гэтым сэнсе падобная да школ Нарвегіі, бо тут, акрамя вучобы, яшчэ шмат розных інтарэсаў. У беларускіх школах ёсць дошкі гонару вучняў — тут заахвочваюць поспехі ў вучобе і развіццё. У Нарвегіі ж усе павінны быць такімі, якія яны ёсць, не клапоцячыся пра тое, каб быць больш здольнымі.

Нарвежскія госці пабывалі ў майстэрнях 185-й школы, наведалі батлейку, а таксама ўрок камп'ютэрнай графікі і спектакль тэатра суседняй 104-й школы, паглядзелі выставу дзіцячых мастацкіх работ. Але ў рэалізацыі праекта "Вікінгі" мінскія школьнікі пайшлі далей запланаванага. Яны вывучалі не толькі гісторыю і культуру далёкай Нарвегіі, а і дасягненні свайго народа.

— У нас ёсць вельмі істотныя дасягненні міжнароднага ўзроўню ў розных галінах навукі, культуры, тэхнікі, — гаворыць дырэктар школы № 185 з мастацкім ухілам Канстанцін Уладзіміравіч Лаўрыновіч. — За 250 гадоў да Цыялкоўскага Казімір Семяновіч вынайшаў ракету тыпу "Дэльта", па якой вучыўся Пётр Першы. Пра гэта ведае ўся Еўропа, бо ў Галандыі быў выдадзены яго падручнік на лацінскай мове. Марцін Пачобут-Адляніцкі дакладна вызначыў месцазнаходжанне Меркурыя, апісаў сонечнае зацьменне і інш. Многія беларусы нават не ведаюць гэтых імёнаў. І такіх прыкладаў вельмі шмат. Паказаць дзецям дасягненні беларусаў вельмі важна — яны будуць ганарыцца за свой народ. І гэты шлях мы абралі асноўным у праекце "Вікінгі".

Сапраўды, дужа добра, што беларускія дзеці ведаюць і пра скандынаўскіх багоў, і пра фіёрды, і пра вікінгаў. Але не менш важна, што яны могуць расказаць паўночным равеснікам пра гісторыю сваёй радзімы. Расказаць з гонарам.

Галіна СІДАРОВІЧ.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

130-годдзе Баранавічаў супала з правядзеннем другога Рэспубліканскага фестывалю духавой музыкі "Беларускія фанфары-2001", у якім прымалі ўдзел 19 калектываў, а гэта больш за 400 чалавек, што прыехалі з усёй рэспублікі, а таксама Польшчы і Расіі. Па цэнтральнай плошчы прайшлі маршам-парадам калектывы, адбыліся выступленні парашутыстаў і верталётчыкаў.

НА ЗДЫМКУ: танцуе баранавіцкі дзіцячы ансамбль "Лялька".

Фота Рамана КАБЯКА, БЕЛТА.

Служба 01 папярэджвае

Галоўная прычына — неасцярожнасць

Сур'ёзны пажар адбыўся ў жылым доме па вуліцы Ленінградскай, 1. Загаранне адбылося на першым паверсе ў выніку парушэння правілаў процiпажарнай бяспекі пры правядзенні агнявых работ (зварачныя работы праводзіліся без афармлення нарада допуску, адсутнічалі першасныя сродкі пажаратушэння). Іскра зваркі трапіла ў перакрыцце паміж паверхамі (у гэтым доме перакрыцці і сцены драўляныя), і адбылося загаранне. Агонь па пустотах пачаў хутка распаўсюджвацца. Замест таго каб неадкладна паведаміць пра пажар на "01", работнікі прыватнай фірмы, якія праводзілі зварку, паспрабавалі ліквідаваць загаранне ўласнымі сіламі. Толькі праз нейкі час, калі стала зразумела, што справіцца з пажарам самастойна ім не ўдасца, была выклікана прафесійная дапамога. Да моманту прыбыцця першых падраздзяленняў агонь ужо дабраўся да трэцяга паверха дома. Ацаніўшы складанасць сітуацыі, пажарныя запрасілі дадатковыя сілы і сродкі. Большасць жыхароў дома знаходзілася на працы, таму пажарным-выратавальнікам, каб пранікнуць у кватэры, давялося ўскрываць масіўныя металічныя дзверы і шклопакеты на вокнах. У шасці кватэрах, многія з якіх былі адрамантаваны і абсталяваны па еўрастандартах, былі праведзены кантрольныя ўскрыцці паверхняў з мэтай выяўлення і ліквідацыі схаваных ачагоў гарэння. Каб пазбегнуць магчымасці паўторнага загарання, на месцы здарэння да 7 гадзін раніцы дзяжурыла аддзяленне выратавальнікаў.

На "01" паступіла паведамленне пра пажар у 2-пакаёвай кватэры на 4 паверсе 5-павярховага дома па вуліцы Р.Люксембург. Да моманту прыбыцця пажарных-выратавальнікаў суседзі ўжо выламалі ўваходныя дзверы, але ўвайсці ў кватэру не змаглі з-за моцнага задымлення. У адным з пакояў гарэлі канапа, шафа, дзверы. Побач з канапай быў знойдзены мёртвы гаспадар кватэры. Дачка загінуўшага, якая пражывае асобна, паведаміла, што яе бацька быў цяжка хворы і ў апошнія некалькі дзён нічога не еў і толькі курыў. Прычынай пажару, у выніку якога загінуў чалавек, стала неасцярожнасць пры курэнні.

У шэсць гадзін раніцы жыльцы аднаго з дамоў па вуліцы Чарнякова паведамілі на "01" пра моцнае задымленне пад'езда. Прыбыўшы на месца, пажарныя-выратавальнікі хутка выявілі, што ў тамбуры тлее матрац, і залілі яго вадой. Пасля гэтага, каб пераканацца ў адсутнасці іншых ачагоў гарэння, было прынята рашэнне агледзець і падвал дома. У адным з памяшканняў быў знойдзены грамадзянін Б., як было высветлена пазней — жыхар гэтага ж дома. Напярэдадні ён, пасварыўшыся з жонкай, бразнуў дзвярыма і пайшоў з дому. Выпіў з гора з выпадковым кампаньёнам ды і пайшоў спаць у падвал. Узяў свой стары матрац, перанёс яго бліжэй да выхаду (каб было больш паветра), пакурыў і заснуў. Калі ад незатушанай цыгарэты задыміў матрац, ён вынес яго наверх, кінуў у тамбуры, а сам пайшоў дасынаць...

На "01" ад жыльцоў аднаго з дамоў па вуліцы Убарэвіча паступіла паведамленне пра пажар у кватэры на трэцім паверсе 5-павярховага дома. Да прыбыцця падраздзяленняў пажарных-выратавальнікаў суседзі, ведаючы пра тое, што ўнутры знаходзіцца чалавек, спрабавалі пранікнуць у кватэру. З замком справіліся, але дзверы ўсё роўна не адчыняліся: перашкаджала нешта знутры. Націснулі мацней — і дзверы ўпалі на падлогу. З прытокам свежага паветра агонь разгарэўся яшчэ больш. Людзі пачалі заліваць полымя вадой, але беспаспяхова. Ліквідаваць яго ўдалося толькі пажарным. Агонь практычна поўнасцю знішчыў усё ў пярэднім пакоі: убудаваную шафу, халадзільнік, крэсла. Цела гаспадыні кватэры было знойдзена ля ўваходных дзвярэй. Як удалося высветліць у ходзе дазнання, загінуўшая апошні год пасля смерці маці злоўжывала спіртным. У выніку гэтага распалася сям'я — муж пайшоў, забраўшы дзіця. З дзецьмі ад першага шлюбу, якія жывуць разам з бацькам у бабулі, яна не сустракалася. Спіртное абарвала ўсе сваяцкія сувязі... Ачаг пажара знаходзіўся ля крэсла. Відаць, загінуўшая, седзячы ў крэсле ля тэлефона, заснула і ўпусціла цыгарэту.

Нядаўна адбылося загаранне ў бытавым памяшканні на тэрыторыі новабудоўлі на праспекце газеты "Известия". Да прыезду падраздзяленняў пажарных-выратавальнікаў бытоўка — спісаны чыгуначны купэйны вагон — была моцна задымлена. Каб знайсці ачаг, давялося абследаваць кожнае памяшканне. І хаця плошча гарэння складала ўсяго каля 8 кв.м, на гэта спатрэбілася больш як 25 мінут. Прычынай жа пажару стала неасцярожнасць пры курэнні ў нецвярозым стане. На карысць гэтай версіі гаворыць і тое, што ні вартаўнік, ні прараб, якія знаходзіліся на месцы пажару, не толькі не змаглі даць якіх-небудзь тлумачэнняў, але і ўвогуле дрэнна трымаліся на нагах. Службовыя асобы ААТ "Волкам", адказныя за выкананне правілаў процiпажарнай бяспекі, былі дастаўлены работнікамі міліцыі ў выцвярэзнік.

Надзвычайнае здарэнне адбылося ў школе-інтэрнаце № 3 па вуліцы Стаханаўскай, 13. У выніку загарання амаль усе памяшканні школы аказаліся ў дыме, таму пажарным і педагогам давялося тэрмінова эвакуіраваць 185 дзяцей. Прычынай пажару стала свавольства з агнём выхаванцаў інтэрната. Яны знялі рашотку з вентыляцыйнай адтуліны ў туалеце, накідалі паперы і падпалілі.

Вярнуўшыся дадому каля трох гадзін ночы, мужчына знайшоў цешчу, звычайна даволі рухавую для сваіх гадоў жанчыну, у ложку пад коўдрай. Яму падалося, што твар у яе нейкі чырвоны. На пытанне пра самаадчуванне старая адказала, што захварэла і ў яе моцна баляць ногі. Адкінуўшы коўдру і ўбачыўшы, што ўсё цела цешчы пакрыта пухірамі, ён неадкладна выклікаў хуткую дапамогу, якая і даставіла бабулю ў бальніцу. У жанчыны было абпалена ўсё цела — 70 працэнтаў паражэння скуранога покрыва 3 і 4 ступені, шок 3 ступені, інгаляцыйная траўма. Пацярпелая памерла праз некалькі гадзін. Над разгадкай здарэння галаву ламаць не давялося. Прычынай няшчасця стаў стары напаўзламаны электраабагравальнік, які захоўваўся ў куце за шафай. Відаць, бабулька замерзла, дастала абагравальнік, паставіла бліжэй і, сагрэўшыся, заснула. Край адзення ці пледа, трапіўшы на распаленую спіраль, загарэўся. Хутка збіць полымя яна не змагла, а дапамагчы не было каму. У выніку яна і атрымала такія цяжкія апёкі.

Наталля ЯРМОЛА,
інспектар пажарнай службы
Партызанскага раёна Мінска.

Праграма тэлеперадач на тыдзень

ПАНЯДЗЕЛАК, 4 ЧЭРВЕНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 18.00, 23.50 Навіны.
7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.00 Рэзананс.
8.53 Выпускны экзамен па беларускай і рускай мовах за курс базавай школы.
9.15 "Усе мае дзеці".
10.10 Тэлебарометр.
10.30 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.15 "Чалавек мора". Серыял.
12.05 "Пакахонтас". Мультсерыял.
13.10 Маст. фільм "Свінарка і пастух".
14.40 Урокі Н. Наважылавай.
15.00 Навіны (з сурдаперакладам).
15.15 Фільм — дзецям. "Аўтамабіль, скрыпка і сабака Клякса".
17.00 "Усе мае дзеці".
18.20 Зона Ікс.
18.30 Палітычныя дыялогі.
19.00 Ж.-П. Бельмандо ў камедыі "Страшыдла".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Правы чалавека: позірк у свет.
22.05 "Чалавек мора". Серыял.
22.55 Стадыён.
23.20 Планета "АРТ".

ГРТ

14.00, 17.00, 23.35 Навіны.
14.20 Зорная гадзіна.
14.45 ...Да шаснаццаці і старэй.
15.20 Мультсерыял "Пакемон".
15.45 "Ералаш".
15.55 "Паветраныя замкі". Серыял.
17.25 "УсеЛенскі патоп". Спецрэпартаж.
17.40 Чакай мяне.
18.40 "Хто хоча стаць мільянерам?".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
21.00 "Сакрэтныя матэрыялы".
22.40 "Сярэбраны шар". Міхаіл Жараў.
23.50 Серыял "Чалавек ніадкуль".

РАСІЯ

7.00, 8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
7.30 "Масква — Мінск".
7.45 "Праваслаўны каляндар".
7.50 "Дзяжурная часць".
8.15 Баявік "Крымінальны квартэт".
10.30 "Санта-Барбара". Серыял.
16.30 "Простыя ісціны". Серыял.
17.00 Серыял "Сетка".
18.00 "Камісар Рэкс".
19.30 Весткі — Масква.
19.50 Баявік "База-2".
21.30 Міхаіл Жванецкі. "Простыя рэчы".
22.30 Пасля вестак.
22.40 Падрабязнасці.
22.50 Камедыя "Журавіны ў цукры".
0.30 "Спорт за тыдзень".
1.25 Дзённік XII Адкрытага расійскага кінафестывалю. Перадача з Сочы.
1.40 Прагноз надвор'я.

КУЛЬТУРА

7.05 Навіны культуры.
7.20 Пасля навін.
7.40 "Залатыя рогі". Маст. фільм.
9.05 Тым часам.
9.30 "Вараны". Дак. фільм.
10.25 "Вясенняя саната". Маст. фільм.
11.30 Навіны культуры.
11.40 "Лаўка старажытнасцяў". Мультфільм.
13.00 "Залаты век фламандскага жывапісу". Частка 1-я.
13.30 Навіны культуры.
13.45 "Пушкін і лёсы рускай культуры".
14.15 Сферы.
15.00 Навіны.
15.10 "Назад у Шэрвуд". Серыял.
15.35 "Шэры Воўк і энд Чырвоная Шапачка". Мультфільм.
16.00 Звышнавука.
16.25 "Вясенняя саната". Маст. фільм.
17.30 Навіны культуры.
17.40 "Свет авіяцыі".
18.05 "За подпісам Яе Вялікасці". Дак. фільм.
18.30 "К. Пендарэцкі зноў у Расіі".
19.10 "Вячэрняя казка".
19.20 "Раз гарох, два гарох...". Мультфільм.
19.30 Навіны культуры.
19.50 "Яна кідае выклік". Спектакль.
21.05 Пасля навін.
21.25 Канцэрт Чык Корыа ў Вялікай зале кансерваторыі.
22.15 Мультфільмы.
22.30 Ад кінаавангарда да відэаарта.
23.00 Навіны культуры.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30 Сёння раніцай.
5.15, 6.15, 7.15 Спорт, надвор'е.
5.20, 6.35 Крымінал.
5.35, 6.50 Вялікія грошы.
5.45, 7.20 У запас.
6.20, 7.40 Карданны вал.
7.50 "Каханне і тайны Сансет Біч".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
9.25 "Каханне і тайны Сансет Біч".
10.25 Крымінал. "Шчырае прызнанне".
11.25 Камедыя "Неспакойная гаспадарка".
13.30 Стары тэлевізар.
14.45 У запас.
15.30 "Элен і рабяты".
16.10 Серыял "Страсць".
17.05 "Жывы Пушкін". Праграма Леаніда Парфёнава.
18.30 Герой дня.
18.45 Крымінал.
19.05 Серыял "Асобы выпадак".
20.15 "Зусім сакрэтна. Інфармацыя да разважання".
21.50 Серыял "Помста без межаў".
23.25 Камедыя "Божыя кароўкі".

СТБ

16.00 "Жалезны чалавек". Мультсерыял.
16.30 "Дыпладокі". Мультсерыял.
17.00 "Потым з'явіўся ты". Серыял.
17.30 Навіны СТБ.
17.45 Гараскоп СТБ.
17.50 "Культурнае жыццё Мінска".
18.00 "Раузан". Тэленавела.
19.00 "Выпадковы сведка".
19.30 Навіны "СТБ—24 гадзіны".
19.45 Віртуальны свет.
19.55 "Культурнае жыццё Мінска".
20.00 "Мэш". Серыял.
20.30 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Марш Турэцкага".
22.05 "Чорная" камедыя "Галава над вадой".
0.05 Навіны СНД.
0.20 Футбольны кур'ер.
0.40 "У напрамку".

АЎТОРАК, 5 ЧЭРВЕНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 18.00, 23.45 Навіны.
7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.05 "Усе мае дзеці".
8.35 Выпускны экзамен па матэматыцы за курс сярэдняй школы.
9.15 "Тайны свет Алекс Мак".
9.40 Стадыён.
10.10 Дак. серыял "У фокусе". Заключны фільм "Паляўнічыя на навіны з Нью-Йорка".
11.15 "Чалавек мора". Серыял.
12.05 Тэленавігатар.
12.30 Арсенал.
13.10 Маст. фільм "Сто дзён пасля дзяцінства".
14.40 Дак. серыял "Скарбы сусветнай культуры".
15.00 Навіны (з сурдаперакладам).
15.10 Мультфільм.
15.20 "Усе на арбіту!".
15.35 "Тайны свет Алекс Мак".
16.05 "5х5".
17.00 "Усе мае дзеці".
18.20 Зона Ікс.
18.35 "Масква — Мінск".
18.55 Д. Хопер у драме "Кароль гары".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.00 "Чалавек мора". Серыял.
22.50 Спорт-кур'ер.
23.00 Ток-шоу "Будні". "Грамадзянскі шлюб".

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.25 Навіны.
8.15 "Паветраныя замкі".
9.15 "Хто хоча стаць мільянерам?".
10.15 Смачныя гісторыі.
10.25 Пакуль усе дома.
14.20 Цар гары.
14.45 ...Да шаснаццаці і старэй.
15.20 Мультсерыял "Пакемон".
15.45 "Ералаш".
15.55 "Паветраныя замкі".
17.25 Рускі экстрым.
17.55 Як гэта было. Палёт касмічнага чаўнака "Буран". 1988 год.
18.40 "Забойная сіла-2: Здольны вучань".
19.45 Добрай ночы малышы!
20.00 Час.
21.00 Фільм "Чалавек нарадзіўся".
22.50 "Цывілізацыя". Артур Эванс.
23.25 Навіны.

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
8.15 Баявік "База-2".
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 "Простыя ісціны". Серыял.
17.00 Серыял "Сетка".
18.00 "Камісар Рэкс".
19.30 Весткі — Масква.
19.50 Дэтэктыў "Забіць Шакала".
21.25 Вялікі рэпартаж РТР. Сяргей Гапонаў. "Танцы залатога дракона".
22.30 Пасля вестак.
22.40 Падрабязнасці.
22.50 Мужчына і жанчына. Барыс Нямцоў.
23.45 Баявік "Снайпер".
1.20 Прагноз надвор'я.

КУЛЬТУРА

7.05 Навіны культуры
7.20 Пасля навін.
7.40 "Папялушка". Маст. фільм.
9.00 С. Пракоф'еў. Саната 7.
9.20 "Свет авіяцыі".
9.45 "Кучугуры і наваколле".
10.30 "Летняя саната". Маст. фільм. Частка 1-я.
11.30 Навіны культуры.
11.40 "Запіскі Піквікскага клуба". Мультфільм.
13.00 "Залаты век фламандскага жывапісу". Частка 2-я.
13.30 Навіны культуры.
13.45 "Разам з Фафалем".
14.00 "Пушкін і лёсы рускай культуры".
14.45 "Паважаны Лясун". Мультфільм.
15.00 Навіны.
15.10 "Назад у Шэрвуд". Серыял.
15.35 "Справа жыццёвая".
16.05 "Мы прыйшлі з мора".
16.30 "Летняя саната". Маст. фільм. Частка 1-я.
17.30 Навіны культуры.
17.40 "Ноў-хау".
17.50 "Крэмль музычны". 2-гі Міжнародны фестываль.
18.30 "Цытаты з жыцця". Філосаф Рыгор Памеранц.
19.10 "Вячэрняя казка".
19.20 "Вялікае закрыццё". Мультфільм.
19.30 Навіны культуры.
19.50 "Кучугуры і наваколле".
20.35 Пасля навін.
20.55 Сцэнаграма.
21.20 "Смерць Арфея". Маст. фільм.
23.00 Навіны культуры.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30 Сёння раніцай.
5.15, 6.15, 7.15 Спорт, надвор'е. 5.20, 6.35 Крымінал.
5.35, 6.50 Вялікія грошы.
5.45, 7.20 У запас.
6.20, 7.40 Карданны вал.
7.50 Серыял "Асобы выпадак".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
9.25 "Каханне і тайны Сансет Біч".
10.25 Крымінал. "Шчырае прызнанне".
11.25 Камедыя "Неспакойная гаспадарка".
13.30 Стары тэлевізар.
14.45 У запас.
15.30 "Элен і рабяты".
16.10 Серыял "Страсць".
17.05 "Жывы Пушкін". Праграма Леаніда Парфёнава.
18.30 Герой дня.
18.45 Крымінал.
19.05 Серыял "Асобы выпадак".
20.15 "Расліннае жыццё".
21.50 Серыял "Помста без межаў".
23.25 Камедыя "Вялікі Булі".

СТБ

6.00 "Жалезны чалавек". Мультсерыял.
6.30 "Дыпладокі". Мультсерыял.
7.00 "Сімпсаны". Мультсерыял.
7.30 Музыка на СТБ.
7.45 "Выпадковы сведка".
8.30 Навіны "СТБ—24 гадзіны".
8.45 Драма "Квартал "Мішн-Хіл".
10.35 Інфармацыйна-пазнавальная праграма "Еўропа сёння".
10.55 "Віртуальны свет".
11.05 "Кінаафіша Мінска".
13.30 Навіны СТБ.
13.45 "Пляж". Серыял.
14.45 "Марш Турэцкага". Серыял.
16.00 "Жалезны чалавек".
16.30 "Дыпладокі". Мультсерыял.
17.00 Потым з'явіўся ты. Серыял.
17.30 Навіны СТБ.
17.45 "Хто я?".
18.00 "Раузан". Тэленавела.
19.00 "Выпадковы сведка".
19.30 Навіны "СТБ—24 гадзіны".
19.45 "Віртуальны свет".
19.55 "Культурнае жыццё Мінска".
20.00 "Мэш". Серыял.
20.30 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Марш Турэцкага". Серыял.
22.05 "Двое — гэта занадта".
0.35 Навіны СНД.
0.50 Кінаальманах "Плошчы і фантазіі".

ЧАЦВЕР, 7 ЧЭРВЕНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 18.00, 23.55 Навіны.
7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.05 "Марская паліцыя". Серыял (ЗША). 1-я серыя.
9.10 "Тайны свет Алекс Мак".
9.30 Мультыклуб.
10.05 Дак. серыял "Дарога да Пушкіна". 3-я і 4-я серыі.
11.15 "Чалавек мора". Серыял.
12.05 Вялікае снеданне.
12.35 25-ы кадр.
13.10 "Маленькія трагедыі". Маст фільм. 2-я серыя.
14.25 Дак. серыял "Скарбы сусветнай культуры" (Германія).
15.00 Навіны (з сурдаперакладам).
15.10 Мультфільм.
15.20 "Усе на арбіту!".
15.35 "Тайны свет Алекс Мак".
16.05 "5х5".
17.00 "Марская паліцыя. 1-я серыя.
18.20 Зона Ікс.
18.30 "Тайныя спружыны палітыкі".
18.55 Г. Самохіна і В. Ціханаў у меладраме "Бульварны раман".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.00 "Чалавек мора".
22.50 Спорт-кур'ер.
23.00 "Сад мары". Перадача для дачнікаў.
23.30 Каралеўскае паляванне.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.55 Навіны.
8.15 "Паветраныя замкі". Серыял. 9.15 "Хто хоча стаць мільянерам?".
10.15 "Каб памялі...". Георгій Юматаў.
14.20 Праграма "100 працэнтаў".
14.45 ...Да шаснаццаці і старэй.
15.20 Мультсерыял "Пакемон".
15.45 "Ералаш".
15.55 "Паветраныя замкі". Серыял.
17.25 Серыял "Усе падарожжы каманды Кусто".
17.55 "Працэс".
18.40 Серыял "Падазрэнне".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
21.00 Фільм "Ты ёсць".
23.10 Джаз. Сусветная гісторыя.

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
8.15 Баявік "Штэмп".
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 "Простыя ісціны". Серыял.
17.00 Серыял "Сетка".
18.00 "Камісар Рэкс".
19.30 Весткі—Масква.
19.50 Баявік "Зона нанясення ўдару".
21.25 "Адчыніце, міліцыя!". Дак. серыял.
22.30 Пасля навін.
22.40 Падрабязнасці.
22.50 Дэтэктыў "На віле".
1.00 Бокс. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу.
1.50 Прагноз надвор'я.

КУЛЬТУРА

15.00 Навіны.
15.15 "Назад у Шэрвуд".
15.35 Мультфільмы.
16.10 А. С. Пушкін "Чудный сон мне Бог послал...".
16.40 "Эмілі". Серыял.
17.30 Навіны культуры.
17.40 Шляхі гасподнія...
18.05 "Улада факта".
18.20 "Час музыкі".
18.45 Парыжскі часопіс.
19.10 "Вячэрняя казка".
19.20 "Велікан-эгаіст". Мультфільм.
19.30 Навіны культуры.
19.50 Тайны партрэтнага фае.
20.15 Пасля навін.
20.35 "Наследніца па прамой". Маст. фільм.
22.05 "Джазафрэнія".
22.30 Мультфільмы.
23.00 Навіны культуры.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00. 7.30 Сёння раніцай.
5.15, 6.15, 7.15 Спорт, надвор'е.
5.20, 6.35 Крымінал.
5.35, 6.50 Вялікія грошы.
5.45, 7.20 У запас.
6.20, 7.40 Карданны вал.
7.50 Серыял "Асобы выпадак".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
9.25 "Каханне і тайны Сансет Біч".
10.25 Кватэрнае пытанне.
11.25 Фільм "Доктар Калюжны".
13.30 Стары тэлевізар.
14.45 У запас.
15.30 "Элен і рабяты".
16.10 Серыял "Страсць".
17.05 "Жывы Пушкін". Праграма Леаніда Парфёнава. Частка 4-я.
18.30 Герой дня.
18.45 Крымінал.
19.05 Серыял "Асобы выпадак".
20.20 Прафесія — рэпарцёр. Міхаіл Крыкуненка. "Рускі мядзведзь".
21.50 Серыял "Помста без межаў".
23.25 Фільм "Мужчыны майго жыцця".

СТБ

6.00 "Жалезны чалавек". Мультсерыял.
6.30 "Дыпладокі". Мультсерыял.
7.00 "Сімпсаны".
7.30 Музыка на СТБ.
7.45 "Выпадковы сведка".
8.30 Навіны "СТБ—24 гадзіны".
8.45 Меладрама "Брытанік".
10.35 "Экстрэмальныя гульні".
10.55 "Віртуальны свет".
11.05 Камедыя "Суперзоркі "Спайнэл Тэп".
12.55 "1/52". Спартыўны агляд.
13.20 "Кінаафіша Мінска".
13.30 Навіны СТБ.
13.45 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
14.00 "Пляж". Серыял.
15.00 "Марш Турэцкага". Серыял.
16.00 "Жалезны чалавек". Мультсерыял.
16.30 "Дыпладокі".
17.00 "Потым з'явіўся ты". Серыял.
17.30 Навіны СТБ.
17.45 Гараскоп СТБ.
17.50 "Культурнае жыццё Мінска".
18.00 "Раузан". Тэленавела.
19.00 "Экзотыка".
19.15 Музыка на СТБ.
19.30 Навіны "СТБ—24 гадзіны".
19.45 "Віртуальны свет".
19.55 "Культурнае жыццё Мінска".
20.00 "Мэш". Серыял.
20.30 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Марш Турэцкага". Серыял.
22.00 Камедыя "Кітайскі сервіз". 0.10 Навіны СНД.
0.25 Камедыя "Суперзоркі "Спайнэл Тэп".

ПЯТНІЦА, 8 ЧЭРВЕНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 18.00, 2.10 Навіны.
7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.00 "Марская паліцыя". 2-я серыя.
8.53 Выпускны экзамен па матэматыцы за курс базавай школы.
9.10 "Тайны свет Алекс Мак".
9.35 Рэпартажы з правінцыі.
10.05 "Шлях да Пушкіна". 5-я і 6-я серыі.
11.15 "Два візіты", "Юбілей". Кароткаметражныя маст. фільмы паводле апавяданняў А. П. Чэхава.
12.00 "Славянскаму базару ў Віцебску — 10 гадоў". Выбранае.
13.10 "Маленькія трагедыі". 3-я серыя.
14.25 "Скарбы сусветнай культуры".
15.00 Навіны (з сурдаперакладам).
15.10 Мультфільм.
15.20 "Усе на арбіту!".
15.35 "Тайны свет Алекс Мак". 16.05 "5х5".
17.00 "Марская паліцыя". 2-я серыя.
18.20 Зона Ікс.
18.30 Свет і мы.
18.50 Ю. Дземіч у маст. фільме "Чалавек з чорнай "Волгі".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.00 VI Нацыянальны фестываль беларускай паэзіі і песні "Маладзечна-2001". Урачыстае адкрыццё. Прамая трансляцыя.
2.00 Спорт-кур'ер.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.40 Навіны.
8.15 "Паветраныя замкі".
9.15 Серыял "Падазрэнне".
10.15 "Каб памялі...". У. Басаў.
14.20 Зорная гадзіна.
14.45 ...Да шаснаццаці і старэй.
15.20 "Пакемон".
15.45 "Ералаш".
15.55 "Паветраныя замкі".
17.25 "Усе падарожжы каманды Кусто".
17.55 Дак. дэтэктыў "Прыгавор. Справа Казлянка. 2001 год".
18.25 Смачныя гісторыі.
18.40 Поле цудаў.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
21.00 Крэмль-9. "Тэхналогія візіту".
21.45 Камедыя "Махлярства, ці Хвост віляе сабакам".
23.55 Рэальная музыка: "Максідром-2001". Частка 3-я.

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі.
8.15 Баявік "Зона нанясення ўдару".
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 "Простыя ісціны".
17.00 "Сетка".
18.00 "Камісар Рэкс".
19.30 Весткі — Масква.
19.50 Фільм "Мардашка".
21.35 Вялікі рэпартаж РТР. "Жыццё — "капейка".
22.30 Пасля вестак.
22.40 Падрабязнасці.
22.50 Баявік "Фенікс".
0.55 Бокс. Чэмпіянат свету. 1/2 фіналу.
2.30 Дзённік XII Адкрытага расійскага кінафестывалю.

КУЛЬТУРА

7.05 Навіны культуры.
7.20 Пасля навін.
7.40 "Маё каханне". Маст. фільм.
9.00 "Пасажыр цягніка 12. Успаміны пра Льва Талстога". Дак. фільм.
9.50 "Эмілі".
11.30 Навіны культуры.
11.40 "Франц Шуберт".
13.00 А. С. Пушкін. "Граф Нулін".
13.30 Навіны культуры.
13.45 "Разам з Фафалем".
13.55 Мультфільм.
14.15 Да 75-годдзя Сімфанічнага аркестра Варонежскай філармоніі пад кіраўніцтвам В. Вярбіцкага.
15.00 Навіны.
15.10 "Назад у Шэрвуд".
15.35 Мультфільм.
16.00 "Малыя музеі Санкт-Пецярбурга".
16.25 Вуліца майго дзяцінства.
16.35 "Эмілі".
17.30 Навіны культуры.
17.40 "Сенсацыя! Сенсацыя? Сенсацыя...".
18.05 Майстры Вялікага тэатра.
18.30 Камера-абскура.
19.10 "Вячэрняя казка".
19.20 Мультфільм.
19.30 Навіны культуры.
19.50 "Пасажыр цягніка 12. Успаміны пра Льва Талстога". Дак. фільм.
20.45 Пасля навін.
21.05 "Вечары з А. Дольскім".
21.30 "Доктар Фауст". Маст. фільм. 1-я серыя.
22.30 Мультфільм для дарослых.
23.00 Навіны культуры.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30 Сёння раніцай.
5.15, 6.15, 7.15 Спорт, надвор'е.
5.20, 6.35 Крымінал.
5.35, 6.50 Вялікія грошы.
5.45, 7.20 У запас.
6.20, 7.40 Карданны вал.
7.50 "Асобы выпадак".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сёння.
9.25 "Каханне і тайны Сансет Біч". 10.25 Падарожжы натураліста.
11.30 Фільм "Доктар Айбаліт".
13.30 Стары тэлевізар.
14.45 У запас.
15.30 "Вуліца Сезам".
15.55 "Страсць".
16.55 "Жывы Пушкін". Частка 5-я. 18.35 Крымінал.
19.00 Крымінальны фільм "Гракі".
21.50 "Жаночы погляд".
22.30 Фільм "Амерыканскі жыгало".

СТБ

6.00 "Жалезны чалавек".
6.30 "Дыпладокі".
7.00 "Сімпсаны".
7.30 Музыка на СТБ.
7.45 "Выпадковы сведка".
8.15 "Святло і цень".
8.30 Навіны "СТБ-24 гадзіны".
8.45 Камедыя "Кітайскі сервіз".
10.35 "Еўропа сёння".
10.55 "Віртуальны свет".
11.05 Прыгодніцкі фільм "Чорны лебедзь".
13.20 "Кінаафіша Мінска".
13.30 Навіны СТБ.
13.45 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
14.00 "Пляж".
15.00 "Марш Турэцкага".
16.00 "Жалезны чалавек".
16.30 "Дыпладокі".
17.00 "Потым з'явіўся ты".
17.30 Навіны СТБ.
17.45 Музычна-забаўляльная праграма.
18.00 "Раузан". Тэленавела.
19.00 "Выпадковы сведка".
19.30 Навіны "СТБ-24 гадзіны".
19.45 "Віртуальны свет".
19.55 "Культурнае жыццё Мінска".
20.00 "Мэш".
20.30 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Марш Турэцкага".
22.00 "Лесвіца ў неба". Дак. фільм.
22.45 Камедыя "Фукс".
0.45 Навіны СНД.
1.00 Прыгодніцкі фільм "Чорны лебедзь".
2.40 Музычна-забаўляльная праграма.

СУБОТА, 9 ЧЭРВЕНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

7.00, 9.00, 15.00, 19.00 Навіны.
7.15 Сутнасць.
7.45 Дак. экран. "Крокі па заходняй граніцы".
8.30 Здароўе.
9.10 "Пакахонтас". 3-я серыя.
9.40 Прэм'ер-парад.
10.10 "Усё нармальна, мама!".
10.45 Сад мары.
11.10 Мультыклуб.
11.35 "Кувалда".
12.35 Каралеўскае паляванне.
13.00 Чароўная шкатулка "Саюзмультфільма". "Палёт на Месяц".
13.35 "25 градусаў на Поўдзень". 3-я серыя.
14.30 Сталіца.
15.10 Ю. Саломін у маст. фільме "Скандальны выпадак у Брыкміле". 1-я і 2-я серыі.
17.25 VI Нацыянальны фестываль беларускай паэзіі і песні "Маладзечна-2001". Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча.
18.25 З дакладных крыніц.
19.20 "Жулі Леско".
21.00 Панарама.
21.35 "Тайныя спружыны палітыкі".
22.00 VI Нацыянальны фестываль беларускай паэзіі і песні "Маладзечна-2001". Аўтарскі канцэрт кампазітара У. Будніка.
1.00 Спорт-кур'ер.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 0.10 Навіны.
8.15 "Паветраныя замкі".
9.10 Поле цудаў.
10.15 "Каб памялі...". У. Іванішоў.
14.20 Краіна цудаў.
15.55 "Паветраныя замкі".
17.25 "З лёгкай парай!".
18.00 Баявік "Гладыятар па найму".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.55 Што? Дзе? Калі? Фінал.
22.20 Фільм "Планкет і Маклейн".
0.25 Дэтэктыў "Прызнанне".

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00 Весткі.
8.15 Фільм "Мардашка".
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 "Простыя ісціны".
17.00 80 гадоў газеце "Труд". Святочны канцэрт.
18.00 "Камісар Рэкс".
19.00 Весткі ў суботу.
19.30 Весткі — Масква.
19.50 Інтэрв'ю А. І. Салжаніцына.
20.15 Фільм "Кантракт са смерцю".
22.45 Бокс. Чэмпіянат свету. Фіналы.
0.25 Чэмпіянат свету па аўтагонках у класе "Формула-1".
1.35 Гарачая дзесятка.

КУЛЬТУРА

9.05 "Бусляня".
9.30 Мультфільм.
9.40 "Путь горний".
10.35 "Эмілі".
11.30 Навіны культуры.
11.40 "Пляменнік Рамо". Маст. фільм.
12.55 Мультфільм.
13.05 "Жывое дрэва рамёстваў".
13.30 Навіны культуры.
13.45 "Разам з Фафалем".
13.55 Мультфільм.
14.15 "Танцуем танга...".
15.00 Навіны.
15.10 "Назад у Шэрвуд".
15.